СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 8.10, 15.51, 7.41;
Гомель — 7.49, 15.45, 7.56;
Віцебск — 8.07, 15.34, 7.26;
Магілёў — 7.59, 15.40, 7.41;
Гродна — 8.24, 16.07, 7.43;
Брэст — 8.17, 16.16, 7.59.
МЕСЯЦ:
Першая квадра 2 снежня
ІМЯНІНЫ
Халімона, Архіпа, Міхала, Яраполка, Пятра, Валяр'яна; Сабы, Хрысціны.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

5 СНЕЖНЯ 1992 г.
субота, № 242 (22020)

РОЗГАЛАС

КІРАЎНІК ПАРЛАМЕНТА ПРЫМАЕ ДЫПЛАМАТАЎ

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч прыняў часовага паверанага ў справах Рэспублікі Балгарыя ў Беларусі Стоіла Міланава Фердава па яго просьбе. Адбылася размова аб развіцці беларуска-балгарскага супрацоўніцтва.

Пытанні развіцця беларуска-амерыканскіх узаемаадносін абмяркоўваліся ў час гутаркі кіраўніка беларускага парламента і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Злучаных Штатаў Амерыкі Дэвіда Х. Суорца, якога Станіслаў Шушкевіч прыняў па яго просьбе.

БЕЛІНФАРМ.

А ХТО БУДЗЕ АБАРАНЯЦЬ РАДЗІМУ?

МІНСК. У сталіцы Беларусі ў час восеньскага прызыву (які яшчэ працягваецца) не з'явіўся на пункты збору кожны пяты юнак-прызыўнік. Акрамя таго, трэцяя частка прызыўнікоў па розных прычынах атрымалі права на адтэрміноўку, а кожны дзесяты «выбракаваны» з-за дрэннага стану здароўя. Так што, паводле даных ваеннага камісарыята Рэспублікі Беларусь, напрыклад, па Мінскай вобласці салдатамі на сённяшні дзень сталі толькі 40 працэнтаў юнакоў прызыўнога ўзросту.

Хто шукае — той знойдзе

БАРАНАВІЧЫ. У горадзе бацькі даўно ўжо не бачаць у дзіцячых магазінах недарагіх і цёплых футраў для сваіх дзетак. Праўда, калі добра пашукаць, то тавар такі можна знайсці, як гэта зрабіў рабочы кантроль, праверыўшы адзін з мясцовых магазінаў. Дарэчы, у яго падсобных памяшканнях народныя дэпутаты і кантралёры акрамя дзіцячага адзення выявілі вязальныя апараты, прасы, цукеркі, тушонку, гарэлку і некалькі тысяч школьных сшыткаў.

Гаспадыня гэтага магазіна № 7 аддзела рабочага забеспячэння «Захадтрансгаз» Наталля Хаміцэвіч канкрэтна не змагла растлумачыць, для каго яна гэта хавала.

Загадку гэтую прыйдзецца разгадваць, па ўсім відаць, народнаму суду.

Сустрэча на Каляды

Нарэшце вызначылася дата правядзення мінскай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў СНД. Як паведамілі карэспандэнту БелаПАН у прэс-цэнтры Рабочай групы Садружнасці, сустрэча адбудзецца 25 снежня.

Віктар ДЗЯТЛІКОВІЧ. (БелаПАН).

РАЗВЕНЧВАЕМ МІФ АБ «САЛОДКІМ» ЖЫЦЦІ

ПІНСК. Калі зусім нядаўна ў горадзе кожны дзень спажывалі да 2 тон кандытарскіх вырабаў, то зараз гэтая лічба скарацілася да 100 кілаграмаў. Прычына адна — дорага. Акрамя таго, лістападаўская датацыя ў 25 мільёнаў рублёў мясцоваму хлебазаводу, на думку яго кіраўніцтва, наўрад ці стрымае рост цэн на хлеб, бо прадпрыемства працуе на старых запасах цукру, мукі і дражджэй. Маргарын дык наогул заканчваецца, аб новых яго пастаўках пакуль што не ўдаецца дагаварыцца ні за якія грошы.

АНДРЭЙ САНГЕЛІ: «Сітуацыя ў Садружнасці была б зусім іншай, каб усе працавалі так, як Рэспубліка Беларусь»

Першымі словамі малдаўскага прэм'ера Андрэя Сангелі, пасля таго як спецсамалёт кампаніі «Малдова эйр-транс» зрабіў пасадку на заледзянелым полі Мінскага міжнароднага аэрапорта, былі такія: каб усе працавалі так у сваёй знешняй палітыцы, як працуе з намі Рэспубліка Беларусь, напэўна, сёння было б зусім іншае становішча ў краінах Садружнасці...

Па ўсім відаць, Малдова выходзіць з крызісу, выкліканага прыднястроўскім канфліктам. Прынамсі знешнепалітычная дзейнасць урада краіны дае падставы так сцвярджаць. З снежня Андрэй Сангелі зрабіў паездку па прыбалтыйскіх рэспубліках і вечарам таго ж дня прыбыў у Мінск. З ім у беларускай сталіцы высадзіўся даволі важкі дэсант з сямі чалавек: намеснік прэм'ера В. Кунеў, міністр гандлю і матэрыяльных рэсурсаў Т. Слэйнэ, першы намеснік міністра фінансаў І. Чэбук і іншыя.

— Мы прыбылі ў Беларусь з вельмі вялікімі планамі і самымі добрымі намерамі, — гаворыць прэм'ер-міністр Малдовы, — каб вырашыць практычныя пытанні і вызначыць нашы далейшыя сумесныя дзеянні.

Міхаіл Мясніковіч, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларусі, які сустракаў дэлегацыю, у сваю чаргу адзначыў:

— Я вельмі задаволены тымі сувязямі і той работай, якая ў нас вядзецца з Малдовай. Пастаўкі з Малдовы ажыццяўляюцца, бадай, лепш, чым з іншых рэспублік. Гэта гаворыць аб адзінстве слова і справы — таго, чаго нам так часта не стае.

Асабліва хацелася б сказаць пра дапамогу, якую аказвае Беларусі Малдова ў справе аздараўлення нашых дзяцей. На ўрадавым узроўні прынята пастанова аб трохмесячным лячэнні і аздараўленні 15 тысяч беларускіх дзяцей з забруджаных раёнаў. Беларусь удзячная ўраду і народу Малдовы за такі гуманны крок.

У той жа дзень позна вечарам ва ўрадавай рэзідэнцыі ў Заслаўі пачаліся двухбаковыя перагаворы, тэма якіх — развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. З беларускага боку ў перагаворах, акрамя М. Мясніковіча, прымалі ўдзел намеснік Старшыні Савета Міністраў М. Косцікаў, міністр рэсурсаў У. Шэпель, міністр фінансаў С. Янчук, міністр гандлю В. Байдак.

У пятніцу апоўдні перагаворы завяршыліся сумеснай прэс-канферэнцыяй для журналістаў.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.



На здымку: у час сустрэчы ў Вярхоўным Савеце рэспублікі.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Мінск—Бон: сувязям мацнець і пашырацца

Усё большую і большую цікавасць праяўляе свет да суверэннай і незалежнай Рэспублікі Беларусь. Сёння практычна не бывае дня, каб да нас з візітам не завіталі кіраўнікі той ці іншай краіны, парламентарыі, дэпутаты, цэлыя дэлегацыі з далёкага і блізкага замежжа.

...У чацвер і пятніцу з афіцыяльным візітам у Мінску знаходзілася дэлегацыя горада Бона (Германія) на чале з обер-бургамістрам доктарам Хансам Даніэльсам. Вялікая цікавасць да гасцей была праяўлена ў нашай сталіцы не выпадкова. Па-першае, паміж Мінскам і Бонам пачынаюць завязвацца вялікія і, будзем спадзявацца, карысныя для абодвух бакоў пастаянныя кантакты: гарады становяцца пабрацімамі. А, па-другое, нашаму боку і ў Бона, і ў Боне ёсць чаму павучыцца: у эканамічным, сацыяльным, культурным жыцці. Таму, калі выканаўчы камітэт Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў на чале з народным дэпутатам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Герасіменкам знайшоў у немцаў паразуменне і падтрымку, было вырашана: сувязі трэба неадкладна ўмацоўваць і пашыраць.

Учора дэлегацыю Бона прыняў Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч.

Обер-бургамістр Ханс Даніэльс правёў да сустрэчы з кіраўніком беларускага парламента вялікую цікавасць. Ведаючы пра нашы цяжкасці ў эканоміцы, госць больш цікавіўся палітычным і сацыяльна-культурным жыццём суверэннай рэспублікі. Як ідзе праца над новай Канстытуцыяй Беларусі, чаму парламент адрэчыў пытанне аб правядзенні рэферэндуму, што стрымлівае пераход рэспублікі да цывілізаваных рынкавых адносін — вось тыя галоўныя пытанні, на якія доктар Даніэльс атрымаў поўныя і канкрэтныя адказы С. Шушкевіча. У сваю чаргу Станіслаў Станіслававіч выказаў вялікае жаданне арыентавацца на Захад як партнёра. Пры гэтым старшыня парламента падкрэсліў, што ўся сутнасць пытання заключаецца сёння ў слабасці нашых магчымасцей па экспарце прадукцыі ў замежныя краіны. Калійныя ўгнаенні, лес, усяго некалькі відаў машын і абсталявання — вось, бадай, і ўся прадукцыя Беларусі, канкурэнтаздольная на сённяшні дзень на заходнім рынку.

Станіслаў Шушкевіч не ўтойваў: нам можна і трэба шмат чаго атрымаць ад дружалюбных партнёрскіх адносін з Федэратыўнай Рэспублікай Германіі. Бон і Мінск, якія ўстанаўліваюць у гэтыя дні канкрэтныя трывалыя сувязі, стануць толькі пачаткам гэтых кантактаў. Хочацца верыць, што ў іх і сапраўды вялікая і ўзаемавыгадная будучыня.

Анатоль МЯСНІКОЎ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ДЗЯРЖКАМСТАТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дзяржкамстат Рэспублікі Беларусь падвёў вынікі работы прамысловасці за 11 месяцаў бягучага года. Яны сведчаць аб паступовым паляпшэнні работы гэтай галіны. Калі ў студзені—жніўні зніжэнне аб'ёмаў прамысловай вытворчасці ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года складала 14,2 працэнта, то ў верасні—10,8, у кастрычніку — 5,8, у лістападзе ўжо дасягнуты рост вытворчасці на 1,3 працэнта.

Палепшылася работа многіх галін прамысловасці. У лістападзе прадукцыя машынабудавання павялічылася на 2,6 працэнта, лёгкай прамысловасці — на 6,4, харчовай — на 3, лясной і дрэваапрацоўчай — на 2 працэнты. Аднак захоўваецца значнае зніжэнне вытворчасці ў паліўнай прамысловасці з-за змяншэння паставак нафты.

БЕЛІНФАРМ.

Наша міліцыя нас беражэ. Калі ёсць бензін

ПАСТАВЫ. (РІД). За некалькі кіламетраў ад літоўскай мяжы супрацоўнікам пастаўскай міліцыі з-за адсутнасці бензіну давялося спыніць праследаванне падазронага аўтафургона, у якім знаходзілася 11 пародзістых коней. У суправаджальных дакументах указвалася, што жывёлін везлі на продаж у саўгас «Стародворскі», але, як высветлілася пазней, у самой гаспадарцы пра гэту здзелку нічога не ведалі.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ Ў ЛІЧБАХ

Было наша—стала маё

Паводле даных Упраўлення прыватызацыі, у Рэспубліцы Беларусь прыватызаваны 124 прадпрыемствы камунальнай і 47 прадпрыемстваў рэспубліканскай уласнасці.

Арэндаванымі калектывамі выкуплены 73 аб'екты, працоўнымі калектывамі — 71, у акцыянерныя таварыствы ператвораны 8 дзяржаўных прадпрыемстваў, адно прыватызавана прыватнай асобай.

Таццяна ШЧЭБЕТ. (БелаПАН).

НА СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Лёгкі бунт на караблі

ці спосаб выпускання крытычнай масы пары?

Станіславу Шушкевічу журналісты, ды і самі дэпутаты часта задаюць пытанне: «Хто належыць да вашай каманды? На якую фракцыю ці групу вы апіраецеся?» На што Станіслаў Станіслававіч нязменна адказвае: «Мая каманда — увесь Вярхоўны Савет». І гэта не проста тактычны ход Старшыні ці нейкая поза, гэта — пазіцыя. У проціборстве палярных сіл, палітычных амбіцый, розных поглядаў на стан спраў у эканоміцы, грамадстве, шляхі выхаду з крызісу, дзе амаль кожны лічыць сябе стратэгам, патрэбна фігура, якая, як хвалялом, гасіла б разбуральныя крайнасці, накіроўвала энергію не толькі парламента, але і краіны ў стваральнае рэчышча. Многія, у тым ліку і дэпутаты, лічылі, што такой фігурай з'яўляецца Шушкевіч. Дзеля справядлівасці зазначым, што час ад часу з розных бакоў чуліся патрабаванні да яго вызначыцца. Пытанне ставілася рубам: скажыце, нарэшце, Станіслаў Станіслававіч, з кім вы, з «кансерватарамі» ці «дэмакратамі»? Былі і абвінавачанні. Цяжкія. Цікава, што набор іх з абодвух лагераў быў адналькавы: здрада беларускаму народу, грэбаванне яго інтарэсамі і г. д. А ён паўтараў: мая каманда — Вярхоўны Савет.

І вось заўчора, у час вячэрняга пасяджэння, пры абмеркаванні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўстве аб Нацыянальным банку «каманда» падняла лёгкі бунт. Яму ўспомнілі ўсё: і Віскулі, і Алма-Ату, і крызіс у эканоміцы, і неплацяжы... З іх, дарэчы, і пачалося.

Праблема гэтая настолькі балючая, а калі яшчэ ўлічыць, што дэпутацкі корпус працэнтаў на 70 складаюць гаспадарнікі і прадстаўнікі выканаўчых структур, якія на сваёй шкуры адчуваюць страшэннае бязладдзе, то рана ці позна яна павінна была выбухнуць. А тут канец года, а на будучы — суцэльны туман. І ні дагаворуў, ні сыравіны, ні грошай. Калі не прыняць тэрміновых мер, магчымы эканамічны калапс, катастрофа. Так што эмоцыі, крыўды, выкрыкі з месца, нават абразы ў адрас адзін аднаго можна зразумець і дараваць. Каб жа толькі яны спрыялі вырашэнню пытання.

Прадстаўнікі дэпутацкай групы «Беларусь» унеслі прапанову: ад імя Вярхоўнага Савета даць даручэнне асабіста С. Шушкевічу тэрмінова сустрэцца з Ельцыным і вырашыць праблему ўзаемных плацяжоў. Думаю, зараз і самі дэпутаты бачаць недакладнасць такой фармулёўкі, але, як хтосьці горача тлумачыў у кулуарах: тут не да фармулёвак, калі хата гарыць.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Самакіраванне ў гандлі: рэальнасць ці фікцыя?

Мала мець свабоду. Трэба яшчэ мець дазвол карыстацца ёю

У нумары «Звязды» за 27 кастрычніка быў змешчаны матэрыял пад назвай «Сям'я — інстытут свяшчэнны. У гандлі тым больш». Там паведамлялася, што дырэктар мінскага магазіна «Богатырь» Галіна Сямёнаўна Мількевіч аказалася для свайго зяця Уладзіміра Васільевіча Шаблінскага без перабольшанняў залатой цешчай. Мала таго, што яна здала зяцеваму таварыству з абмежаванай адказнасцю «Трэйдзінт ЛТД» частку гандлёвай плошчы свайго магазіна, дык яшчэ ў верасні адпусціла па дзяржцане вялікую партыю абутку. З гэтай здзелкі магазін меў «навар з яек», а зяць — добрую капейчыну, бо ў ягонай фірме цэны на абутак куды вышэйшыя.

Гісторыя атрымала нечаканы працяг. Галіна Сямёнаўна назвала публікацыю поўнай хлуснёй. Для такой заявы патрабуецца пэўная, скажам так, смеласць, бо незразумела, як могуць хлусіць лічбы накладной, на якой, уласна кажучы, і будаваўся газетны матэрыял. Тому, натуральна, у калектыва магазіна (дакладней, арэндна-гандлёвага прадпрыемства) узніклі сумненні ў шчырасці свайго дырэктара. Калектыў сёе-тое самастойна праверыў, супаставіў і... цвёрда вырашыў пазбавіцца ад такога кіраўніка.

Але лепш па парадку.

Мількевіч у магазіне — чалавек новы. У пачатку гэтага года, калі папярэдні дырэктар пайшла на пенсію, прывялі яе і прадставілі калектыву: вось вам вопытная, энергічная і г. д. У тым, што энергічная, ператаналіся хутка — магазін змяніўся да непазнавальнасці.

Раней «Богатырь» добра ведалі ў горадзе і вобласці як магазін адзення і абутку для поўных і высокіх людзей — такая была спецыялізацыя. Зараз клопатамі Мількевіч атрымалася нешта незразумелае: унізе посуд і гаспадарчыя тавары, наверсе — мэбля, пасярэдзіне — «камок». Плошчы пад адзенне і абутак скарачаюцца няўмольна.

І на тое, каб зяцёў «Трэйдзінт ЛТД» уладкаваць, энергіі хапіла. Спачатку, праўда, не прызнавалася, што зяць. Сказала: выканком просіць дапамагчы стаць на ногі адной камерцыйнай фірме, нават патрабуе. Ну, проста няёмка адмовіць. А потым пачаліся гэтыя боты-чаравікі, і не толькі яны. Ды што там абутак! Дробязь у параўнанні з астатнімі паслугамі.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

РАДЫЁ ФАКТ

У Полацку зарэгістравана новае паліграфічнае прадпрыемства «Спадчына Францыска Скарыны». Узнікла яно на базе існуючай друкарні і свабодных вытворчых памяшканняў вытворчага аб'яднання «Шкловалакно». Мера гэта вымушаная, таму што будаўніцтва новай друкарні перакрэсліла інфляцыя.

***

«Лістапад» — так называецца мясцовае віно талачынскага вінна-гарэлачнага завода. Віно нізкага гатунку, утрымлівае павышаную дозу фарбавальніку. Аднак апошняе павышэнне цэн на гарэлку зрабіла «Лістапад» самым хадавым таварам. Вінны цэх завода стаў сапраўдным манетным дварам горада.

***

Салігорскі райвыканком строга папярэдзіў мясцовага фермера Муравіцкага за неэфектыўнае выкарыстанне зямлі. Справа ў тым, што з пасаджаных у гэтым годзе 12 гектараў бульбы адзін гектар ён не здолеў убраць наогул.

***

У самым цэнтры Каўнаса са сквера перад музычным тэатрам украдзены дзве бронзавыя скульптуры дзеячаў культуры Літвы. З тэрыторыі Іонаўскага прадпрыемства камунальнай гаспадаркі ўкрадзены бронзавы бюст Леніна вагою 5 тон. Вось так «палююць» у Літве за бронзай. За апошнія восем месяцаў 1.110 крадзяжоў каляровых металаў адбыліся ў Літве толькі на аб'ектах, якія ахоўваюцца.

Удакладненне

У «Звяздзе» за 2 снежня быў надрукаваны Закон Рэспублікі Беларусь «Аб статусе ваеннаслужачых». Як паведаміла рабочая група па падрыхтоўцы гэтага праекта, у рэдакцыю быў перададзены тэкст прынятага Закона з прапушчаным абзацам. У пункце 1 артыкула 11 трэба дадаць трэці абзац:

«Грашовае забеспячэнне сяржантаў, старшын, салдат і матросаў тэрміновай службы, якія праходзяць яе па прызыву, павінна быць не менш палавіны мінімальнай заработнай платы».

ХАТНЯЯ ЗНІЦЫКЛАПЕДЫЯ

ВАША ЗДАРОЎЕ

Як усцерагчыся ад прастуды і грыпу

Халоднае сырое надвор'е і не вельмі цёплыя батарэі ў нашых кватэрах — сігнал таго, што ў калідорах паліклінік вырасці чэргі хворых прастудай і грыпам. Як усцерагчыся ад гэтых непрыемных захворванняў?

Часта на кашаль, насмарк і павышаную тэмпературу не звяртаюць вялікай увагі — маўляў, дробязь, пройдзе. У сапраўднасці ж яны вельмі небяспечныя. Прастуды і вірусы грыпу аслабляюць арганізм і змяншаюць яго супраціўляльнасць да іншых хвароб. Засцерагчыся ад іх можна, выконваючы нескладаныя правілы.

* Часта бывайце на свежым паветры. Кісларод ажыўляе і ўмацоўвае імунную сістэму.

* Рэгулярна карыстайцеся саўнай і лазняй. Іх патагонны эфект узмоцніць вашу супраціўляльнасць інфекцыям. Тым, хто ўжо прастуджаны, варта адмовіцца ад гэтага дзеля таго, каб не перагружаць сістэму кровазвароту.

* Ужывайце як мага больш вітамін С. Гэта павінны быць не абавязкова дражэ ці прэпараты з аптэкі. Замест гэтага ешце шмат садавіны. Асабліва каштоўным носьбітам вітаміну С з'яўляюцца яблыкі, апельсіны і плады шыпшыны.

* Рабіце рэгулярныя інгаляцыі з рамонку, эўкаліпту і іншых экстрактаў лекавых зёлак. Эфірныя і араматычныя алеі, што ўтрымліваюцца ў іх, выдатна папярэджваюць грып. Дадатковы станоўчы эфект у тым, што ваша скура стане больш эластычнай.

* Апранайцеся ў адпаведнасці з надвор'ем. У зімовыя месяцы асабліва рэкамендуецца вопратка з бавоўны ці іншых натуральных тканін. Звяртайце ўвагу на цёплы абутак.

Міні-гімнастыка

Як хочацца часам па розных прычынах скараціць свае заняткі фізкультурай да мінімуму, але адначасова зрабіць так, каб выбраныя практыкаванні былі эфектыўнымі для як мага большай колькасці мышцаў і органаў цела. Такім практыкаваннем можа быць «цуда-нахіл».

Безумоўна, абмежавацца толькі адным гэтым практыкаваннем на працягу ўсяго жыцця немагчыма. Яно здольна дапамагчы вам у «цяжкую хвіліну», калі няма часу на звычайную гімнастыку. Гэта практыкаванне сумяшчае ў сабе шмат карыснага для ног, рук, гнуткасці цела і пазваночніка, нават для прытоку неабходнай колькасці крыві да галавы чалавека пры празмерным ператамленні. Яго можна выконваць і дома, і на працы, нават у гасцях (толькі лепш там, дзе ніхто не бачыць).

З асноўнай стойкі зрабіце вельмі павольна нахіл уперад. Кісцямі рук трэба дакрануцца да падлогі. Спачатку — толькі кончыкамі пальцаў, а з цягам часу, пры больш глыбокім нахіле, — далонямі. Зафіксаваць такое становішча на максімальна магчымы час. Галава пры нахіле апушчана, — магчыма, вы дакраняцеся носам да каленяў. Вярнуцца ў зыходнае становішча (таксама вельмі павольна). Пры выкананні практыкавання старайцеся не горбіцца. Выконваць практыкаванне не больш за тры разы. Калі раптам закружыцца галава, неадкладна прысядзьце на крэсла, — вам гэта практыкаванне не падыходзіць у якасці аптымальнай замены ўсяго гімнастычнага комплексу. Пашукайце што-небудзь іншае.

СМАЧНА ЕСЦІ!

Духмяная кава

Чорную каву гатуюць звычайнай (1 ч. л. на кубачак вады) і двайной крэпасці (ад 2 да 3 ч. л.). Кафейнік прапаласкваюць гарачай вадой, кладуць каву, заліваюць кіпенем, даводзяць да кіпення, потым здымаюць, даюць 5 хвілін адстаяцца. Галоўная ўмова прыгатавання смачнай кавы — не кіпяціць яе, а толькі давесці да кіпення і адразу ж зняць з агню. Каву двайной крэпасці варыць двойчы: першы раз варыць звычайную чорную каву, даюць ёй адстаяцца, потым у яе кладуць другую порцыю молатай кавы і зноў даводзяць да кіпення, адстойваюць і падаюць.

Варыць чорную каву з цукорыем і без яго. Цукорый кладуць на смак (звычайна на 5 частак кавы 1 частку цукорыю). Чорную каву на дэсерт можна падаць з лікёрам або тонка нарэзаным лімонам.

Смак і водар кавы маюць мноства адценняў, а які спадабаецца вам, паспрабуйце выбраць самі. Пры прыгатаванні кавы памятайце пра нескладаныя правілы.

* Па-першае: для варкі кавы бяруць толькі мяккую ваду. Калі вада жорсткая, можна пакласці ў яе кавалачак цукру.

* Па-другое: варыць каву трэба ў спецыяльна прызначаным для гэтага посудзе, заўсёды чыста вымытым, без пабочных пахаў.

* Па-трэцяе: асабліва смачная кава атрымліваецца пры змешванні гатункаў. Напрыклад, калі ёсць магчымасць, — 2 часткі арабікі, 1 частка бразільскай і 1 частка калумбійскай, або па 1 частцы арабікі і бразільскай і 2 часткі кавы «харэм».

А вось некалькі спосабаў прыгатавання духмянай кавы.

Кава па-арабску

2 кавалачкі цукру заліць халоднай вадой (100 г), давесці да кіпення, зняць з агню, пакласці 2 чайныя лыжкі натуральнай молатай кавы і зноў давесці да кіпення і зняць (ні ў якім выпадку не кіпяціць).

Кава па-ўсходняму

Засыпце ў турку 2 чайныя лыжкі молатай натуральнай кавы, пакладзіце 2 кавалачкі цукру, наліце 100 г вады, пастаўце на агонь і, як толькі на каве падымаецца пена, здыміце з агню і разліце ў кубачкі. Падайце ў шклянцы халоднай кіпячонай вады.

Можна прыгатаваць каву **«пад шубай»**

У кубачак насыпце 2 чайныя лыжкі растваральнай кавы, 2 чайныя лыжкі цукру, дадайце 1 чайную лыжку кіпеню і перамешвайце лыжкай сумесь да таго часу, пакуль яна не стане светлай. Даліце 100 г вады (кіпеню) — кава гатовая: тоўстая пена добра захоўвае яе водар.

Кава па-варшаўску

У 50 г моцнай чорнай кавы дадаць (каб атрымалася шклянка) 125 г малака і чайную лыжку цукру, пасля чаго зноў давесці да кіпення, а перад тым, як падаць на стол звараную каву, злёгку ўзбіць, каб на паверхні напітку ўтварылася пена.

Кава па-венску

У няпоўную шклянку чорнай кавы пакласці 2 ч. л. цукру. Ва ўзбітыя вяршкі (40 г) дадаць 1 ч. л. цукру і пакласці ў каву. У вяршкі можна дадаць таксама крыху ваніліну, а зверху пасыпаць цёртым шакладам.

Кава з марожаным (глясэ)

У няпоўную шклянку халоднай чорнай кавы, зваранай з цукрам, пакласці шарык сметанковага марожанага (можна пламбір).

Карысныя парады

* Сушаную зеляніну пры прыгатаванні супоў трэба варыць дастаткова доўга, таму што смак яе праяўляецца пасля гадзіны варкі.

* Каб гародніна не пераварвалася, кладзіце яе ў каструлю не адначасова, а ў наступнай паслядоўнасці: спачатку буракі, потым моркву, потым капусту і ўжо напаследак бульбу.

* Дробка цукру, кінутая ў ваду пры варцы гародніны, значна палепшыць яе смак.

Лекавая гарбата з лісця

Гарбата з лісця не з'яўляецца сурагатам, гэта — паўнацэнны напітак, які можна выкарыстоўваць як лекавы сродак. Састаў і гатунак траў час ад часу неабходна мяняць. На кубачак гарбаты бяруць 1—1,5 чайнай лыжкі лісця.

Састаў траў

1. Да лісця маліны, суніцы, ажыны ў аднолькавых прапорцыях дадаць сцяблі мяты (5 працэнтаў ад агульнага саставу).

2. Да лісця суніцы, ажыны ў аднолькавых прапорцыях дадаць лісце падбелу (10 працэнтаў ад агульнага саставу).

Гарбата з яблыкаў. 1 шклянка яблычных лупін, 1 л вады. Яблычныя лупіны ўсыпаць у ваду і варыць 10—15 хвілін на слабым агні.

ЖАНОЧАЯ КРАСА...

І НАСІЛА СЕМ ПРОМНЯЎ ЛЯ СКРОНЯЎ...

УПРЫГАЖЭННІ ЯК ЭТНІЧНЫЯ СІМВАЛЫ

Найбольш нам вядома аб упрыгажэннях пачатку нашага тысячагоддзя — часоў Полацкага і Тураўскага княстваў. Гэта былі часы росквіту культуры ва Усходняй Еўропе. У нашых гарадах квітнелі мастацкія рамёствы. Майстры добра валодалі ліццём, чаканкай, гравіроўкай па металу, мастацкім ткацтвам. Ювеліры валодалі такімі складанымі тэхнічнымі прыёмамі, як зерань, скань, чэрнь, пазалота. Развітой была вытворчасць шкляных пацерак і бранзалетаў. У час археалагічных раскопак выяўлены ювелірныя майстэрні ў Мінску, Тураве, Навагрудку.

Упрыгажэнні з'яўляліся выразнай этнічнай адметнасцю, асабліва ў вясковага насельніцтва. Асноўную ролю ў якасці паказчыка этнасу выконвалі скроневыя кольцы, якія прымацоўваліся ці прышываліся да галаўнога ўбору над скронямі. Так, полацкія крывічанкі насілі дротавыя бранзалетападобныя скроневыя кольцы з завязанымі канцамі (мал. 1). У дрыгавічанак (Цэнтральная Беларусь) былі дротавыя пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы з нанізанымі на іх металічнымі зярнёнымі пацеркамі (мал. 2) У радзімічанак (Пасожжа) былі ў модзе сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы (мал. 3). Колькасць скроневых кольцаў залежала ад заможнасці жанчыны.

Для радзімічанак, акрамя сяміпрамянёвых скроневых кольцаў, характэрны былі шыйныя пласцінчастыя грыўні і грыўні з разеткападобнымі бляшкамі на канцах, фібулы колападобныя і карáлі, у якіх пацеркі спалучаліся з пятлістымі падвескамі ці падвескамі-месячыкамі.

У тыя часы ўпрыгажэнні насілі і мужчыны, асабліва крывічы. Мужчынскімі ўпрыгажэннямі былі падковападобныя фібулы, якія насіліся як на адзенні, так і на поясе, пярсцёнкі, а ў крывічоў часта і бранзалеты. Да паясоў прымацоўваліся падвескі-бразготкі, сцізорыкі, скураныя сумачкі.

Амаль тысячу гадоў таму назад у народным касцюме ўжо праяўляюцца і агульныя рысы для ўсёй тэрыторыі Беларусі. У жанчын гэта бранзалеты са стылізаванымі звярынымі галоўкамі, карáлі з пацерак у спалучэнні з падвескамі, шыйныя грыўні, сцізорыкі ў скураных футаралах, якія звычайна падвешваліся да пояса або прымацоўваліся да адзення каля пляча. Такія ўпрыгажэнні падобныя на прыбалтыйскія, але адрозніваюцца ў дэталях, што сведчыць аб іх мясцовым паходжанні. Наогул, у старажытнасці, як і ў нядаўнім мінулым, кожная вёска мела свае адрозненні ў касцюме. Калі этнографы гэта адзначаюць у вышыўцы, то 11—12 стагоддзі пазначаны наборамі металічных упрыгажэнняў у курганах.

Гаворачы аб старажытных упрыгажэннях, варта звярнуць увагу на пацеркі, асабліва мода на якія была ў 11—12 стагоддзях. Іх налічвалася некалькі соцень відаў. Самымі распаўсюджанымі пацеркамі былі пацеркі з «рубленага бісеру» сіняга, жоўтага і зялёнага колераў. Насілі таксама сердалікавыя, буртынавыя, крыштальныя, амеціставыя і яшмавыя пацеркі. Звычайна карáлі рабіліся з пацерак розных відаў. Яны нанізваліся на льняны ці шаўковы шнурок, конскі волас, дрот. Часцей за ўсё насілася адна нізка пацерак, але сустракаюцца ў курганах па дзве і тры нізкі, а часам і да 9-ці. Пацеркі выкарыстоўваліся і замест гузікаў. Імі таксама расшываліся адзенне, галаўныя ўборы і абутак.

Упрыгажэннямі рук былі пярсцёнкі і бранзалеты. Колькасць пярсцёнкаў дасягала 10-ці, але звычайна іх насілі ад 1 да 4-х. Пярсцёнкі рабіліся дротавыя ў некалькі абаротаў, пласцінчастыя, шырокасярэдзінныя і інш. Бранзалеты былі дротавыя, плеценыя, са стылізаванымі звярынымі галоўкамі, пласцінчастыя арнаментаваныя і г. д. (гл. малюнкі). Узор на пласцінчастых бранзалетах складаўся з розных зігзагаў, ромбаў, кружочкаў з кропкай у пэнтры, пункцірных ліній. Кожны элемент арнаменту быў звязаны з язычніцкай сімволікай і лічыўся своеасаблівым абярогам.

Упрыгажэнні гараджан адрозніваліся ад упрыгажэнняў вяскоўцаў. У гарады сцякалася насельніцтва з розных зямель. Напачатку яно трымалася свайго племяннога касцюма, але з цягам часу склалася і своеасаблівая гарадская мода. Тыпова гарадскімі ўпрыгажэннямі сталі шкляныя бранзалеты і пярсцёнкі. На рукаве белай ільняной кашулі рознакаляровыя бранзалеты глядзеліся непаўторна. Мода на форму і колер бранзалетаў часта мянялася. Напрыклад, у Мінску ў канцы XI — пачатку XII стагоддзя ў модзе былі блакітныя, сінія і чорныя бранзалеты, а пазней — зялёныя і карычневыя.

Тыпова гарадскімі былі і скроневыя ўпрыгажэнні — колты. Яны былі полымі, і мяркуюць, што туды ўкладвалася тканіна, змочаная пахучымі масламі. Колты падвешваліся на ланцужках ці скураных раменьчыках да галаўнога ўбору. Колты знойдзены ў Мінску, Гародні, Навагрудку, Бярэсці. У гарадах ёсць знаходкі каменных абразкоў і каменных крыжыкаў, якія часта былі апраўлены ў серабро ці золата.

Сярод каштоўных упрыгажэнняў, знойдзеных у гарадах, — медальён з гравіраванай выявай Святога Дэмітрыя (Ваўкавыск), абразок са слядамі пазалоты з выявамі Алены і Канстанціна (Полацк), залатая пацерка (Лукомль), залатыя завушніцы (Барысаў, Гродна) і да т. п. Уяўленне аб упрыгажэннях знаці даюць і рэчавыя скарбы, якіх шмат на Беларусі. Так, у Дзяргянскім скарбе (Капыльскі раён) разам з манетамі было 20 ювелірных упрыгажэнняў (пярсцёнкі з гранёнымі камянямі, пласцінчастыя бранзалеты, пацеркавыя скроневыя кольцы). Пяць залатых бранзалетаў знаходзіліся ў адным з полацкіх скарбаў. Добра захаваліся рэчы ў Вішчынскім скарбе (Рагачоўскі раён). Тут былі колты, бранзалеты, расны. Усе вырабы з высакапробнага серабра, а некаторыя і пазалочаныя.

Людміла ДУЧЫЦ.

▲ Рэканструкцыя жаночага касцюма па матэрыялах раскопак курганнага пахавання XI стагоддзя (вёска Чарневічы Глыбоцкага раёна).

Малюнкі Вольгі АВАКУМАВАЙ.

БЕЛАРУШЧЫНА

...І МУЖЧЫНСКАЯ СЛАВА

НА ЗАГЛЯДЗЕННЕ

Такі эскіз будучай формы для роты гаварой варты распрацавалі мастакі М. КУПАВА, В. ДЗЁМКІНА і Ю. ПІСКУН.

Ён адабраны сярод іншых варыянтаў Камісіяй па забеспячэнню адзінай палітыкі выкарыстання дзяржаўных сімвалаў пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь.

Па ідэі аўтараў новай формы, на шэўроне павінен быць абрыс «ефрасіньеўскага крыжа», на пагонах — чатырохканцовыя зоркі, а на кукардзе — вядома ж, «Пагоня».

Канчатковы варыянт будзе прыняты пасля ўдакладнення некаторых дэталяў.



● ЯК ПІШАМ? ЯК БУДЗЕМ?

Рана засыпаць старую студню

Размова аб праблемах беларускага правапісу (гл. «Звязду» за 13 і 26 лістапада) выклікала цікавасць у чытачоў. Сёння друкуем ліст з Мінска.

Я не лічу сябе рэтраградам. Змены ў правапісе — дык змены! Толькі каб гэта было на карысць народу і мове. Зноў жа да змен трэба ісці цывілізавана, падрыхтавана, аргументавана. А пакуль козыраў не бачу, не пераканаўся, што існуючы правапіс трэба пускаць пад сякеру.

Па-першае, невядома, чым яго замяніць, бо адны прапануюць лацінку, другія кірыліцу-гарашкевіцу, трэція — увогуле нешта накшталт мовы «Полісься». Нельга засыпаць старую студню, не выкапаўшы новай!

Па-другое, людзі пачалі, як адзначалася вышэй, цягнуцца пацёку да роднага слова, і, калі мы станем займацца эксперыментамі з мовай на афіцыяльным узроўні, то краху, на мой погляд, не мінуць.

Па-трэцяе, у цяжкім стане эканоміка, нестабільнасць у палітыцы і г. д. Думаю, зразумела, што мова — гэта ядро дзяржавы і нацыі. Якая ні ёсць, сучасная літаратурная мова сёння існуе. Яе стваралі Янка Купала, Якуб Колас, Пімен Панчанка, Кандрат Крапіва, Максім Танк, Міхась Лынькоў, Янка Маўр, Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч і многія-многія іншыя нацыянальныя літаратары і патрыёты. Дык што — іх творы пад нож? З чым пойдзем у нацыянальныя школы?

Сёння паралельна з афіцыяльным існуе некалькі відаў правапісу. І ўсё ж усім нам трэба зразумець: толькі кансалідацыя, уменне шукаць кампрамісы, падаўленне асабістых амбіцый і законапаслухмянасць дапамогуць умацаваць Айчыну і адрадзіць мову.

Скажам, я не прымаю душой «клясы», «мелёдыі», «філялёгію», «філёзофію», «у грудзёх» і бачу, што самі прапагандысты такіх формаў непаслядоўныя ў сваёй прэсе і часам там (асабліва на перыферыі і ў сматужных выданнях) цэлы калейдаскоп непастаянства, супярэчнасцей і абсурду. Але калі гэты правапіс унармуецца і будзе зацверджаны на дзяржаўным узроўні ў выніку скрупулёзнага навуковага аналізу і абмеркавання ў самых розных слаях насельніцтва, я павінен буду змірыцца і падпарадкавацца закону. Тут можна правесці аналогію з аўтаправілямі: парушэнне іх прыводзіць да аварый. Табе падабаецца ехаць на левым баку вуліцы — дакажы, што гэта зручней, і дачакайся, пакуль такая змена будзе ўхвалена і зацверджана афіцыяльна.

Наконт мяккага знака ў мяне думка такая: калі чалавек мову ведае, то для яго праблемы не існуе. А ў адваротным выпадку і ўвядзенне мяккага знака дасць нямнога. Хіба толькі ён будзе сімвалам Адраджэння, што не адмаўляю. Самае галоўнае, каб мова выжыла і стала паўсядзённай неабходнасцю кожнага грамадзяніна дзяржавы Беларусь.

Янусь МАЛЕЦ.

Ці жывуць у Гомелі нашчадкі легендарнага Гома?

У навуковай літаратуры яшчэ ў 1971 годзе была выказана версія, згодна з якой Гомель атрымаў сваю назву ад асабовага імя купца Гомала (ці Гамола). Чалавек з такім імем быў упамянуты ў дагаворы кіеўскага князя Ігара з грэкамі ў 945 годзе.

Аўтар гэтай версіі тапаніміст С. В. Фралова, улічваючы наяўнасць іншых (акрамя **Гомель**) старажытных формаў назвы горада — **Гомій, Гомей**, дапускае магчымасць тлумачэння тапоніма і ад імя **Гом**, якое мог насіць пэўны валадар, правадыр, князь.

У гэтай сувязі нельга не звярнуць увагі на мясцовае паданне аб разбойніку XII стагоддзя па імені Гом, які нібыта жыў у былой паўночна-ўсходняй частцы Гомеля, вядомай пад назвай «Каўказ». Легендзе пра Гома адшукваюцца пэўныя тыпалагічныя паралелі ў іншых мясцовасцях, калі палічыць, што наш Гом — не проста разбойнік, а знакаміты продак, верагодны прабацька, нават заснавальнік горада (тыпалогія дазваляе рабіць такія высновы: параўнайце легенды аб заснаванні Кіева — Кіем, Растова — Растам). Сюжэты падобных легенд з цягам часу «ўскладняюцца» разнастайнымі, нават нечаканымі, падрабязнасцямі (лічыцца, напрыклад, што пачынальнік Кіева Кій быў перавозчыкам на Дняпры). З заснаваннем Магілёва звязана «дзейнасць» легендарнага разбойніка Машэкі. Такім чынам, паданне пра Гома вартае ўвагі, нават калі і ўлічыць, што ў легендах-паданнях імёны мяркуемых заснавальнікаў гарадоў вельмі часта ўтвараюцца... ад саміх тапонімаў, назваў адпаведных населеных пунктаў.

На нашу думку, безагаворачнае сцвярджэнне аб тым, што Гомель — гэта «горад Гома» было б паспешлівым, бо ёсць і іншыя факты і меркаванні наконт паходжання назвы горада (гл., напрыклад, кніжку аўтара гэтых радкоў «Сцежкі ў даўніну. Геаграфічныя назвы Беларускага Палесся». Мн.: Полымя, 1992). І тым не менш, хто ведае...

Гомельскі краязнаўца Уладзімір Ларыёнаў вырашыў высветліць, ці распаўсюджаны ў сучасным Гомелі прозвішчы, якія прама ці ўскосна маюць дачыненне да гэтых імёнаў — Гамол, Гомал, Гом. З дапамогай супрацоўнікаў пашпартнага стала Упраўлення ўнутраных спраў аблыканкома ён выявіў 265 чалавек, якія, на яго погляд, носяць адпаведныя прозвішчы. Усяго такіх прозвішчаў — 31. Сабраны матэрыял У. С. Ларыёнаў перадаў аўтару гэтых радкоў на своеасаблівую лінгвістычную «экспертызу». І вось што высветлілася.

У вялікай частцы запісаных прозвішчаў вычляняецца зусім іншая ўтваральная аснова, якая ніяк не звязана з імёнамі купца X стагоддзя ці разбойніка Гома. З ліку запісаных трэба выкрасліць наступныя прозвішчы: Гамарка (Гамарко), Гамарык, Гаманюк, Гаманькоў, Гомак (Гамак), Гоман, Гоманаў, Гамаюраў, Гамаюнаў, Гамацкі, Гамарнік, Гоманец, Гамбалеўскі, Гамеза, Гомза (Гамза), Гомазаў, Гомус, Гамшэй, Гамераў (Гомераў), Гамідаў.

Многія з гэтых прозвішчаў можна без цяжкасці растлумачыць з дапамогай дыялектных слоўнікаў беларускай, рускай і польскай моў. Напрыклад, **Гамарнік** — «той, хто працуе на гамарні», **гамарня** — «медны завод». Магчыма і іншае тлумачэнне: **Гамарнік** — «шумлівы чалавек», «той, хто любіць шумныя гутаркі» (ад слова **гамарня** — «шумная гутарка»), **гамарык** — «той, хто шуміць пры гутарках». У Гомелі якраз зафіксавана прозвішча **Гамарык**. Пад гэтае апошняе тлумачэнне падпадаюць і прозвішчы **Гамарка (Гамарко)**, магчыма, таксама **Гамарнік** і нават **Гамераў**, хоць апошняе лепш супастаўляць з беларускімі прозвішчамі **Хамрыка, Хамрышка**, англійскім тыпу **Хомер**, італьянскім **Амера** і г. д., якія азначаюць «сляпы» (параўнайце грэчаскае імя **Гамер** — «сляпы»).

Прозвішча **Гамаюнаў** тлумачыцца ад слова **гамаюн** — «клапатлівы, руплівы, старанны, працавіты». Прозвішчы **Гамза, Гамеза, Гомазаў**, магчыма, **Гомус (з Гомаз?)**. І нават **Гамшэй** можна разумець пры супастаўленні са словамі **гомзаць, гамзаць** — «мітусіцца, круціцца», «павольна есці, жаваць», «біць штуркамі, калаціць», «гаварыць у нос, гугнявіць», «лаяць, бэсціць» (гл. напрыклад, «Слоўнік беларускай мовы» І. І. Насовіча, «Толковый словарь живого великорусского языка» У. І. Даля, «Тураўскі слоўнік», «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы»).

Проста тлумачацца і прозвішчы **Гоман, Гоманаў, Гоманец, Гаманькоў, Гаманюк** — ад слова **гоман** — «шум, крык» ці «гаворка, размова» (**Гоман, Гоманаў** і г. д. — «чалавек крыклівы» ці «гаварлівы»). Прозвішча **Гамбалеўскі** ўзыходзіць да слова **гамбаль** — «грубіян»; **Гамбаль, Гамбалеўскі** — «той, хто гамбіць, зневажае» (**гамбіць** — дыялектны варыянт слова **ганьбіць**).

Звернемся цяпер да прозвішчаў, якія, на наш погляд, маюць нешта блізкае ці нават агульнае з прозвішчамі (мянушкамі, імёнамі) **Гомал, Гамол, Гом** (легендарныя і летапісныя асобы, зразумела, прозвішчаў не мелі). Есць два аманімічныя, гэта значыць зусім розныя карані (асновы) **гом**. З аднаго боку, мы маем дыялектнае слова **гом** у значэнні «крык, шум; гаворка, размова, смех; сварка». З іншага боку, **гом** і звязанае з ім вытворнае слова **гамола, гамол, гамула** ў шэрагу славянскіх і балцкіх дыялектаў спакон веку азначала «нешта пукатае», «круглае», «камяк», «катылёк», «галка», «ўзгорак». Цікава нагадаць, напрыклад, беларускае дыялектнае **гамула** — «бульбяная клёцка» (усходняя Магілёўшчына), польскае **«гомулка»** — «камяк», «круглы сялянскі сыр»; літоўскае **«гамала»** — «снежны камяк», **«гамулас»** — «цюк, кіпа, куча».

З апошнімі прыкладамі можна смела супастаўляць наступныя прозвішчы гамяльчан: **Гамаляка, Гамолка, Гамлявы, Гамульскі, Гамалей**, ды й імя летапіснага купца **Гомала, Гамола**. Усе гэтыя асабовыя імёны першапачаткова мелі значэнне «маленькі тоўсты чалавек», «таўстун-каратыш» ці «гарбаты, гарбун». Прозвішчы **Гамелін, Гамолін** указваюць, што іх першыя носьбіты з'яўляліся нейкімі людзьмі па мянушцы Гамела, Гамола ці яго нашчадкамі (дзецьмі, унукамі). Прозвішча **Гамялькоў** таксама мае значэнне прыналежнасці: **Гамялькоў** — «той, хто належыць Гамяльку, Гамельку» ці «сын, унук Гамелькі».

Каля 180 чалавек у Гомелі носяць прозвішчы **Гомак**. Яно ўтворана ад першапачатковай мянушкі **Гом** (параўнайце: **Звонак** ад **Звон, Зуёнак** ад **Зуй**). З дапамогай суфіксаў **-ак, -ёнак** утвараліся мянушкі (прозвішчы) зноў-такі малодшых прадстаўнікоў сям'і, роду — дзеці ці ўнукі нейкіх Гома, Звона, Зуя і г. д. Як бачым, у Гомелі сапраўды шмат патомкаў Гома. Толькі вось якога Гома?

Два чалавекі сярод сучасных гамяльчан маюць прозвішчы **Гома**, дзесяць чалавек — **Гомаў (Гомаў** — «той, хто належыць Гому» ці «сын, унук Гома»). Есць яшчэ прозвішчы **Гамацкі (Гамацкі** — «патомак нейкага Гомака») і **Гамко (Гамко** — «малодшы прадстаўнік роду Гома»). Апошняе прозвішча тыпалагічна падобнае да прозвішча **Гомак**.

Які ж вывад можна зрабіць? На нашу думку, матэрыял, які разглядаўся, пэўным чынам падмацоўвае версію аб паходжанні назвы **Гомель** ад асабовага імя **Гом, Гамол, Гомал**. Аднак цалкам даказаць ці абвергнуць гэтую версію наўрад ці калі-небудзь удасца.

Аляксандр РОГАЛЕЎ,
кандыдат філалагічных навук.

ЗААПАРК У КВАТЭРЫ

«Мова» кошак

Калі кошка фыркае, значыць, настрой у яе дрэнны. Гэта вядома ўсім. А ці ведаеце вы, што кошка можа «сказаць» яшчэ вельмі шмат?

Мурлыканне абазначае добры настрой. Але ўстаноўлена таксама, што кошка, мурлыкаючы ў непрыемнай сітуацыі, напрыклад, на стале ў ветэрынара, дае зразумець, што яна настроена міралюбіва. Вывернутыя або прыціснутыя вушы гаворыць аб нездаволенасці або нават раздражнёнасці. Калі кошка выгінае спіну дугой, значыць, яна настроена агрэсіўна. Калі ж яна пры гэтым, падняўшы хвост, трэсца аб вашы ногі, значыць, проста хоча, каб яе пагладзілі.

І ўвогуле, хвост гаворыць пра многае. Калі кошка б'е сябе па баках хвастом, значыць, яна ўсхваляваная або засмучаная. Высока падняты хвост абазначае прывітанне, а калі ён яшчэ і падрыгвае, то шчырую сімпатыю. Сваю любоў і давер кошка выказвае, прыціскаючыся да вас галавою. Яна асабліва любіць засоўваць галаву ў працягнутую руку. Калі кошка штурхае вас лапай, значыць, яна хоча з вамі пагуляць. Аднак сцеражыцеся, калі Мурка падыме лапу, выпусціўшы пры гэтым кіпцюры! Гэта пагроза!

Кошка можа выказаць свае пачуцці нават поўсцю. Калі поўсць у яе на хрыбце тапырыцца, значыць, яна спужалася і збіраецца збегчы. Калі ў яе падымаецца поўсць па ўсім целе, гэта значыць, што яна хоча здавацца вялікай і моцнай і, магчыма, нападзе. Калі кошка хоча, каб яе пакінулі ў спакоі, яна звычайна сыходзіць. Калі да яе чапляюцца, замахваецца лапай з выпушчанымі кіпцюрамі.

БАЦЬКОЎСКАЯ ПЕДАГОГІКА

Калі ў сям'і першакласнік

Вельмі часта на бацькоўскіх сходах ад настаўніка можна пачуць: «Забыўся прынесці рэчы, не вывучыў верш, не падрыхтаваў заданне» і г. д. Усе гэтыя і іншыя «мінусы» ідуць ад неарганізаванасці ў сям'і.

Неарганізаваных дзяцей няшмат у класе, але яны сур'ёзна перашкаджаюць займацца астатнім. Дрэнны прыклад заразны.

З першага школьнага дня змагацца за поспехі сына ці дачкі — значыць вучыць быць арганізаваным: разам складаць партфель, не забываць пра такія прадметы, як маляванне, праца, фізкультура; разам рабіць урокі (дзеці павінны пераканацца, што іх можна выканаць хутка, калі быць уседлівым, сканцэнтраваным пры выкананні заданняў): вучыць прытрымлівацца рэжыму — асновы любой працы. Паступова дзіця пачне рабіць ўсё гэта самастойна.

Але кантроль павінен быць няспынным і абавязкова тактоўным. Як мага больш патрабавальнасці да дзіцяці, як мага больш павагі да яго.

— Давай паглядзім, як ты выканаў урокі, якія атрымаў адзнакі? — такое пытанне павінна быць штодзённым.

Дзіця павінна заўсёды адчуваць, што бацькі засмучаюцца, калі ў яго не ладзяцца справы, і радуюцца разам з ім яго поспехам, нават маленькім.

Вучэнне дзіцяці — гэта праца. Праца чалавека павінна заўважацца, ацэньвацца. Самае страшнае ў гэтай справе — раўнадушша і абыякавасць да вучобы вашага сына ці дачкі.

Калі ў вас замшавае паліто

Такое адзенне патрабуе ўмелага догляду. Ваша новае замшавае паліто пакідае на касцюме ці суконцы нібы налёт пылу, які ўтварыўся пры апрацоўцы матэрыялу і яшчэ не асыпаўся. Трэба пачысціць паліто пыласосам з насадкай для апрацоўкі дывана. Каб каўнер, рукавы і кішэні даўжэй не заласніліся, трэба час ад часу праціраць іх кавалачкам прагумаванай тканіны або грубай губкай. Імі ж выдаляюць плямы, якія засталіся пасля дажджу. Месцы згібаў можна асвяжыць тонкай наждачнай паперай.

СЯМЕЙНАЯ МАЙСТЭРНЯ

Цацкі сваімі рукамі



З невялікіх кавалачкаў шчыльнай тканіны, такой, як драп, сукно, з кавалачкаў фетру або скуры можна разам з дзецьмі зрабіць шмат розных смешных істот. Мы прапануем парсючка, пінгвіна і жабку. Усе яны робяцца па адной выкрайцы. Для кожнай цацкі зрабіце 2 загатоўкі тулава. Потым трэба выразаць дробныя дэталі: вушы, вочы, лапкі. Потым на адну загатоўку ўніверсальным клеем наклеіць усе часткі, якія выступаюць: парсючку — вушы і капыткі, пінгвіну — лапы і крылы, жабцы — вочы і лапкі. Потым зверху наклеіць другую загатоўку тулава, а потым на яе ўсе астатнія дэталі. Гэтыя цацкі можна выкарыстоўваць як закладку, тады ў пачатку работы паміж дзвюма загатоўкамі трэба ўклеіць стужку даўжынёй 18—20 см. Гэтых звяранят можна зрабіць і з каляровай паперы.

Рукавіцы са старых шкарпэтак

Калі пашукаць, то ў кожным доме знойдзецца некалькі пар старых шарсцяных шкарпэтак. Пятка і ступня шкарпэтак звычайна зношваюцца вельмі хутка. Выкідаць іх шкада, а латка не заўсёды эфектыўная. Вось і ляжаць старыя шкарпэткі, чакаюць свайго часу. А з іх можна лёгка і хутка змайстраваць цёплыя і прыгожыя рукавічкі для дзіцяці.

На 1 пару рукавіц патрэбны дзве пары шкарпэтак. З верхняй часткі шкарпэткі выкройваецца ўласна рукавічка і асобна — вялікі палец. Усё, што на малюнку заштрыхавана, ідзе ў адход (можна парэзаць і выкарыстаць для набівання мяккіх цацак). Застрочваем на машынцы швы, апрацоўваем «зігзагам», вывярочваем адну пару — тую, якая пойдзе на верхнюю частку рукавіцы. Прыфастрыгоўваем вялікі палец і асцярожна, каб не расцягнулася шво, прыстрочваем. Устаўляем адну рукавіцу ў другую і прыхопліваем ніткай уверсе рукавіцы і вялікі палец. А аснову рукавіцы сшываем, не зацягваючы моцна, праз край.

Рукавіцы гатовыя. Застаецца іх упрыгожыць: вышыць або прышыць кветачкі, арнамент, зорачкі, сняжынкі і г. д.

Зручна тое, што гумка ўжо ёсць і рукавіца шчыльна абхопліваецца запясце. Можна зрабіць рукавіцы інакш — не застрочваць на машынцы, а, асцярожна выцягнуўшы абрэзаныя ніткі, давязаць верх на спіцах або кручком. Вялікі палец таксама можна вязаць. Ніткі могуць адрозніваць па колеру—рукавіцы ад гэтага зробяцца толькі больш прыкметнымі і прыгожымі.

Для больш халоднага надвор'я можна зрабіць такую пару: пракласці ўнутры слой цёплай тканіны. Такія рукавіцы не толькі цёплыя, але і «непрадувальныя».



Падстаўка пад абутак

Для захоўвання абутку можна зрабіць зручныя падстаўкі, якія змяшчаюцца ўнутры шафы або ў калідоры пад вешалкай.

Тоўсты дрот згінаюць у выглядзе пятлі і прымацоўваюць яе да драўлянага бруска. На драцяныя петлі надзяваюць абутак. У такім стане ён не мнецца і захоўвае форму.



ВОЗГАЛАС РОЗГАЛАС

За паўтара года мы сталі больш разумнымі. У галіне СНІДу

Людзі з большым разуменнем сталі падыходзіць да праблем СНІДу — гаварылася на прэс-канферэнцыі, якая падводзіла вынікі акцыі «Дзеячы культуры і мастацтва супраць СНІДу». Усе дабрачынныя канцэрты, вечары праходзілі пры перапоўненых залах. Мэта — прыцягнуць увагу да праблемы і стварыць дабрачынны фонд, напэўна, была дасягнута: многія прадпрыемствы, арганізацыі вырашылі ўнесці ўклад у справу спынення інфекцыі, паступалі таксама грашовыя пералічэнні ад асобных людзей. Сабраныя сродкі будуць выкарыстаны на санітарна-асветніцкую работу (усё ж ханжаскую мараль грамадства не лёгка прабіць ведамі аб хваробе) і на дапамогу непасрэдна віч-інфіцыраваным.

Нямецкая кінематаграфістка Хільдэгард Вестбельд, якая прыняла ўдзел у прэс-канферэнцыі, сказала, што, трапіўшы на Беларусь упершыню паўтара года назад, яна была ўражана невуцтвам і абыякавасцю насельніцтва да праблемы СНІДу. Беларускі цэнтр па прафілактыцы СНІДу не толькі прарваў заслону маўчання па «далікатных» тэмах, але арганізаваў акцыяй засяродзіў увагу грамадскасці на будучыні нацыі.

ЦІ ЎКРАДУЦЬ... МОСТ?

РЭЧЫЦА. (У. Пернікаў). Жыхары гэтага горада з іроніяй габраўцаў задаюць сабе такое пытанне: што будзе, калі ўкрадуць новы мост, які ўзводзіцца праз Днепр недалёка ад вёскі Гарошкава? І адказваюць: ды нічога, украдуць — і не будзе моста.

Жарты жартамі, але такая перасцярога, аказваецца, мае пад сабой пэўную аснову. Бо на будаўнічай пляцоўцы крадзяжы адбываюцца, лічы, кожны месяц. Першы раз тут звалаклі ёмістасць на колах аб'ёмам у адзін кубаметр вадкасці. У другі — узламалі рашоткі на вокнах вагончыка і «прырабілі ногі» 20 рулонам металічнай сеткі. У трэці — з механізмаў, якія потым доўга «кульгалі», садралі 120 кілаграмаў меднага кабелю...

Страты велізарныя, а генпадрадчык — Мінскае будаўнічае ўпраўленне № 4 трэста «Мостабуд» ніяк не здагадаецца наняць сюды вартаўнікоў. Магчыма, дачакаецца, што нехта ўкрадзе і быкі — апоры збудавання.

У банкаўскай сям'і чакаецца папаўненне

Магчыма, хутка ў фінансавых колах Беларусі з'явіцца новы аўтарытэт. Як паведамілі ў Саюзе прадпрымальнікаў рэспублікі, ужо сёння вядзецца адбор лепшых праектаў па стварэнню Банка развіцця малога бізнесу. Ен закліканы аказваць падтрымку новым прадпрымальніцкім структурам і мае ўстаўны капітал амаль 200 мільёнаў рублёў.

Ірына ЛЕЎШЫНА. (БелаПАН).

КАЛІ ПРАГНОЗЫ НЕ РАДУЮЦЬ

МІНСК. Па прагнозах гарадскога ўпраўлення статыстыкі, аб'ём выпуску прадуктаў харчавання ў сталіцы Беларусі да канца года скароціцца на трэць. Каля 100 прадпрыемстваў, хутчэй за ўсё, сустрэнуць 1993 год са стратамі. Гэта ў першую чаргу арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гандлю, бытавога абслугоўвання. Сталічныя статыстыкі прагназуюць таксама, што да канца бягучага года тавары стануць даражэй, чым у мінулым годзе, у 13—14 разоў, паслугі — у 11—12, а колькасць беспрацоўных у Мінску перавысіць 7 тысяч чалавек.

ЯГВЕ РАЗГНЕВАЎСЯ

СЛОНІМ. (А. Дук). У магазінах «Дываны» і № 44, якія знаходзяцца ў памяшканні былой сінагогі, абвалілася столь. На шчасце, гэта адбылося ноччу, і ніхто не пацярпеў. Хоць Ягве (іудзейскі бог) і прагневаўся за тое, што ў святых сценах вядзецца гандаль, але ад ахвяр адмовіўся.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

РАДЫЁ «СВАБОДА»

*** Амерыканскі касмічны карабель шматразовага выкарыстання «Дыскаверы» стартаваў у сераду пасля паўтарагадзіннай затрымкі, выкліканай халодным надвор'ем. У складзе экіпажа — пяць чалавек. Яны выведуць на арбіту спадарожнік Міністэрства абароны ЗША.**

*** У той час, калі ў Германіі толькі ў гэтым месяцы папрасілі палітычнае прыстанішча каля 38 тысяч бежанцаў, нямецкія палітыкі ўвесь час дыскутуюць аб тым, як зменшыць паток непажаданых гасцей. А ўсяго звыш 400 тысяч чалавек пажадалі сёлета атрымаць прыстанішча ў ФРГ. Гэта на 75 працэнтаў больш, чым летась. Наплыў эмігрантаў, заявіў канцлер Гельмут Коль, ставіць краіну ў вельмі цяжкае становішча і ў гэтым адна з галоўных прычын разгулу насілля сярод чужынцаў.**

*** Пасля заключэння пагаднення з прафсаюзам «Салідарнасць» польскі ўрад выказаў надзею, што такія пагадненні могуць быць заключаны і з іншымі прафсаюзнымі аб'яднаннямі краіны. Прэс-сакратар польскага ўрада Мінеўскі заявіў, што дагавор датычыць справы падтрымкі польскіх рыначных рэформаў і мараторыя на забастоўкі.**

*** Прэзідэнт Балгарыі Жалеў прапанаваў сфарміраваць новы ўрад краіны былому палітэмігранту Баяджыеву. Кандыдатура Баяджыева была вылучана апазіцыйнай Балгарскай сацыялістычнай партыяй — былой камуністычнай. Пяць тыдняў назад парламент вынес вотум недаверу прэм'ер-міністру Дзімітраву, які нарыстаўся падтрымкай партыі «Саюз дэмакратычных сіл».**

*** Міністр замежных спраў Ізраіля Перэс заявіў, што яго краіна ўступіць у перагаворы з любым дзеячам, якога палесцінцы выберуць сваім кіраўніком, калі нават гэта будзе Ясір Арафат, Ізраіль, сказаў ён, не будзе ўмешвацца ў палесцінскія выбары.**

«БІ-БІ-СІ»

*** Прэм'ер-міністр Грэцыі Міцатакіс звярнуўся да свайго кабінета міністраў з просьбай падаць у адстаўку перад тым, як будзе аб'яўлены новы склад кабінета. Гэты крок з'явіўся вынікам нядаўняй крытыкі ў адрас кабінета з выпадку эканамічнай і знешняй палітыкі ўрада Міцатакіса. Новы склад прэм'ер-міністр паабяцаў сфарміраваць на працягу сутак.**

БЕСПРАЦОЎНЫЯ ЎЗБРОЙВАЮЦЦА

ГОМЕЛЬ. (У. Пернікаў). Самаробны пісталет і тры малакаліберныя патроны да яго канфіскавалі работнікі органаў унутраных спраў у непрацуючага В. Бычкова. У такога ж непрацуючага В. Грошава яны адабралі сямізарадны рэвальвер, выраблены ў заводскіх умовах, і два карабкі малакаліберных патронаў.

А нідзе не працуючы А. Голда і навучэнец ПТВ-67 П. Брушко былі на Цэнтральным рынку з трынаццацю патронамі рознага калібра.

Беспрацоўныя ўзбройваюцца. Дзеля чаго б гэта?

МЫ ТАКАЯ НАЦЫЯ, ШТО НАМ СТРАШНАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ?

Згодна з данымі даследчага праекта, праведзенага Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), больш палавіны апытаных выступаюць за прыватызацыю ў сельскай гаспадарцы. Іншая справа — прыватызацыя ў прамысловасці. Прапануем параўнаць:

«Наколькі дапушчальная прыватызацыя ў сельскай гаспадарцы?»

Варыянт адказу	Працэнт адказаўшых
1. Усё прыватызаваць	28,0
2. Прыватызаваць часткова	30,3
3. Прыватызацыя недапушчальная	6,0
4. Цяжка адказаць	32,3
5. Не адказалі	3,5

«Наколькі дапушчальная прыватызацыя буйной прамысловасці?»

Варыянт адказу	Працэнт адказаўшых
1. Усё прыватызаваць	7,8
2. Прыватызаваць часткова	24,4
3. Прыватызацыя недапушчальная	26,3
4. Цяжка адказаць	37,2
5. Не адказалі	4,3

Выкладзеныя вынікі, на думку аўтара праекта кандыдата фізіка-матэматычных навук Ю. Дракахруста, не дазваляюць прыйсці да спрошчаных высноў накшталт: «Беларускі народ адверг камунізм і імкнецца да дэмакратыі і рыначнай эканомікі» ці «Беларускі народ застаўся верны сацыялістычнаму выбару». Адзінае, дарэчы, што можна сказаць, дык гэта тое, што беларускае грамадства змяняецца, засвойваючы каштоўнасці і ўяўленні, якія ўласцівы ўсё ж дэмакратычнаму грамадству з рыначнай эканомікай.

ПРЫБЫТАК — ТОЛЬКІ ПАСЛЯ ВЫРУЧКІ

Ужо трэці месяц пасля доўгага вымушанага «прастою» дзейнічае брэсцкі рэчавы рынак. Прычым даволі паспяхова: за верасень рынак сабраў выручку ў 1 мільён 133 тысячы рублёў. У кастрычніку яна ўзрасла да 1 мільёна 962 тысяч рублёў. Чыстага прыбытку пакуль няма, таму што дырэкцыя рынку яшчэ не разплацілася за банкаўскія крэдыты і не выплаціла ўсе даўгі арганізацыям аблспажыўсаюза, якія дапамагалі пры адкрыцці рынка. Аднак, мяркуючы па ўсім, прыбытак доўга чакаць не прымусіць.

БелаПАН.

Калгасы выходзяць на знешні рынак

ВАЎКАВЫСК. Мясцовы райвыканком дазволіў 19 калгасам і саўгасам, а таксама пчолаб'яднанню, райсельгасхіміі, райаграпрамтэхніцы і райсельэнерга займацца знешнеэканамічнай дзейнасцю. Цяпер вышэйназваныя калектывы маюць поўнае права заключаць неабходныя бартэрныя здзелкі і знаходзіць сабе партнёраў на ўзаемавыгадных умовах.

Непрывабныя лічбы

МАГІЛЕЎ. На Магілёўшчыне ў зоне адсялення яшчэ працягваюць пражываць 185 тысяч чалавек, з іх 80 тысяч дзяцей. Такую непрывабную лічбу назваў у выступленні на адной з нарад старшыня камісіі па ахове працы і чарнобыльскіх праблемах Федэрацыі прафсаюзаў вобласці М. Папкоў.

Самакіраванне ў гандлі: рэальнасць ці фікцыя?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Вось, напрыклад, плацежнае даручэнне № 137, згодна з якім АГП «Богатырь» пералічвае на рахунак ТАА «Трэйдзінт ЛТД» пяцьсот тысяч рублёў у якасці папярэдняй аплаты за тавары па дагавору аб сумеснай дзейнасці ад 15.08.92 г. Папярэдняя аплата — з'ява нармальная. Але той, каму тавар прызначаецца, звычайна імкнецца атрымаць яго як мага хутчэй, праз дзень-два. «Богатырь» атрымаў абяцанае 26 кастрычніка. Гэта значыць, што два з лішкам месяцы Шаблінскі карыстаўся чужым паўмільёнам рублёў. Каб ён браў крэдыт у банку, плаціў бы нядрэнны працэнт (недзе каля дваццаці ў месяц). А тут — зусім бясплатна. Застаецца толькі здагадвацца, колькі разоў маглі «пракруціцца» гэтыя грошы ва ўмелага чалавека. І гэта нават лепш, чым беспрацэнтнае крэдытаванне, бо зяць яшчэ атрымаў ад цешчы за сваю каштоўную пасрэдніцкую дзейнасць дзесяць працэнтаў ад сумы здзелкі. Можа такі бізнес не спадабаецца? Не можа! Таму 20 кастрычніка, згодна з плацёжным даручэннем № 182, «Богатырь» пералічвае ў якасці папярэдняй аплаты за тавары на рахунак «Трэйдзінт ЛТД» яшчэ трыста восемдзесят тысяч рублёў. Тавару дагэтуль няма.

А колькі плацяць арандатары гандлёвых плошчаў магазіна? Фірма, што гандлюе мэбляй, за два месяцы пералічыла 250 тысяч рублёў. Зяцеў «Трэйдзінт ЛТД» за квартал — ажно шэсць тысяч трыста.

Ужо даволі доўгі час у АГП «Богатырь» няма галоўнага бухгалтара, з-за чаго калектыў церпіць шмат няўручнасцей. Вакантнае месца трымалася для адной жанчыны, якая павінна была вось-вось сюды перайсці. Але раптам аказалася, што яна ўжо не хоча. Затое — вось супадзенне! — гэту не апошнюю па значнасці пасаду не супраць заняць сястра Уладзіміра Васільевіча Шаблінскага. А клапатлівая цешча, зразумела, не супраць зноў пайсці зяцю насустрач.

Карацей, усё гэта калектыву надакучыла. А калі сюды дадаліся не зусім анёльскі характар Галіны Сямёнаўны і — што вельмі немалаважна — яе цвёрды намер ператварыць палову магазіна ў аўтасалон «Вольва», скараціўшы шмат людзей, адбыўся выбух.

23 лістапада калектыў магазіна сабраўся на агульны сход і, выказаўшы свайму дырэктару недавер, прапанаваў ёй пакінуць пасаду.

Яшчэ год назад гэта было б немагчыма, а зараз — чаму не? 26 мая гэтага года арэндна-гандлёвае прадпрыемства «Богатырь» зарэгістравала ў Фрунзенскім райвыканкоме свой статут, дзе сказана, што дырэктара выбірае агульны сход. І перавыбірае, вядома. На які тэрмін дырэктар займае пасаду, там не акрэслена, таму калектыў мае права яго перавыбраць у любы момант. Калі статут — сапраўды дакумент, а не пустая паперка для адводу вачэй.

Прагаласавалі, пастанавілі, запісалі. Але дырэктар Мількевіч спраў не здае, пячатку трымае пры сабе, выходзіць на работу і нават распрацоўвае падрабязныя планы на наступны год. Падначаленыя забегалі — у выканком, у гарадское ўпраўленне гандлю, нават у Вярхоўны Савет. У адказ на розных узроўнях толькі паціскание плячамі.

Нарэшце намеснік начальніка Мінгаргандлю М. Еўтухоўскі прапанаваў сабрацца пагутарыць. «Пра што? Мы ўжо ўсё вырашылі — не хочам з ёю працаваць!» — запярэчыў было народ. Але начальства трэба слухацца. Паслухаліся. З другой ці трэцяй спробы новы сход адбыўся другога снежня.

Адразу высветлілася, што, хоць папярэдні сход і быў правамоцным (вызваляць Мількевіч можна — выбіралася яна не на пэўны тэрмін і асобнага кантракта з упраўленнем гандлю не заключала), рашэнне на ім прынята няправільнае. Вызваліўшы Мількевіч, сход не выбраў адразу новага дырэктара, а ўсклаў выкананне дырэктарскіх абавязкаў на савет працоўнага калектыву. Гэта немагчыма, паколькі некаму трэба працаваць з разліковымі рахункамі, і ў банку павінен быць узор подпісу дырэктара, а не цэлага савета.

Добра, згаджаецца калектыў. Прабачце, не юрысты — памыліліся. Давайце хуценька прагаласуем — у нас ёсць кандыдатура. «Нельга, — пярэчыць юрысконсульт эканамічнага аддзела выканкома Таццяна Нізовіч, — спачатку скажыце, якія ў вас да Мількевіч прэтэнзіі».

Народ зноў шуміць — навошта ўсё спачатку? А Нізовіч цярпліва тлумачыць: для звальнення чалавека з работы павінны быць падставы. А раптам Мількевіч захоча праз суд аднаўляцца? Што тады ў судзе будзеце казаць — не сышліся характарамі? Гэты довад дзейнічае, і пачынаюцца расказы, як Галіна Сямёнаўна не лічылася з саветам працоўнага калектыву, як прымала процілеглыя прапановам людзей рашэнні, як карала за кожную дробязь і г. д.

«А дакументы ў вас ёсць? А пратаколы, у якіх адлюстроўваліся процілеглыя дырэктарскім думкі, захаваліся? Чым вы можаце пацвердзіць вашы словы?» — пытаецца юрысконсульт. І стомленым голасам, быццам яна настаўніца пачатковых класаў, а перад ёю стрыжаныя шасцігодкі, якім яна ўжо, можа, паўгадзіны тлумачыць, што двойчы два — менавіта чатыры, а не пяць і не шэсць, паўтарае: «Вось бачыце, няма нічога. Самі вінаватыя, што не фіксавалі».

Трэба быць вельмі далёкім ад гандлёвых праблем чалавекам, каб патрабаваць ад прадаўца ці загадчыка секцыі дакументальных сведчанняў канфліктаў з начальствам. У гандлі, як у арміі, поўная залежнасць ад начальства, якое заўсёды мае рацыю. Пачнеш «качаць правы» — выйдзеш на пенсію капітанам, а то і ўвогуле свайго не даслужыш. Патрапіць пад скарачэнне лягчэй лёгкага, даказвай потым, што табе за крытыку помсцяць. І ў гэтым выпадку нездарма калектыў падняўся ўвесь як адзін, каб потым, калі што, дырэктар не палявала на адзіночак.

І ці так ужо неабходны тыя доказы? Навошта рабіць выгляд, быццам звальненне па артыкулу і перавыбары — адно і тое ж? Дырэктар страціла давер калектыву (адна сітуацыя з зяцем чаго вартая!), калектыў вырашыў, што яна не можа больш яго ўзначальваць. Як гэта называецца на мове закона? Здаецца, неадпаведнасць займаемай пасадзе? А што да пагрозы судовага працэсу, дык асабіста я не чуў, каб які-небудзь начальнік, пазбавіўшыся выбарнай пасады, падаваў на калектыў у суд: маўляў, сякі-такі, пасмеў мяне не выбраць!

Устае Міхаіл Міхайлавіч Еўтухоўскі: «У што вы ператварылі магазін? Ён згубіў сваё аблічча!»

Гэта не мы! Гэта яна! Таму мы і хочам памяняць яе!

Але Еўтухоўскі працягвае, націскаючы менавіта на **вы**: «**Вы** не ўзгаднялі з упраўленнем здачу плошчаў у субарэнду, упраўленне мае права скасаваць з вамі дагавор».

Пры жаданні ў гэтай заяве можна пачуць і пагрозу: маўляў, будзеце занадта сваволнічаць — канец вашай арэндзе. Забыліся, хто тут гаспадар? Але, мажліва, я і памыляюся. Праўда, няцяжка здагадацца, што ўпраўленне не зведвае вялікай радасці ад падобных парасткаў дэмакратыі. І не Мількевіч Мінгаргандаль і выканком ратуюць, проста не хочуць ствараць прэцэдэнт. Толькі дазволь камусьці, дык і астатнія пачнуць. Кім тады кіраваць?

Нарэшце, неяк наспех (ужо позна, амаль ва ўсіх дзеці) прымаецца нікога не задавальняючае рашэнне. Дырэктара на гэтым сходзе не перавыбіраць, бо Мількевіч, хоць і прысутнічае, але мае бюлетэнь. Хворых крыўдзіць нельга. На перыяд яе хваробы абавязкі дырэктара выконвае намеснік старшыні працоўнага калектыву. Адначасова ствараецца камісія, якая павінна шукаць тое, чаго няма і што нікому не патрэбна, — дакументальныя сведчанні канфліктаў. Калі Мількевіч закрые бюлетэнь, усё пачнецца спачатку.

Развязка зноў адцягнута, але ці надоўга? Галіна Сямёнаўна можа прадоўжыць бюлетэнь, але ж не бясконца — так і на інваліднасць прапануюць.

Колькі б нехта ні цягнуў час, утрымліваючы вялікі магазін у «падвешаным» стане, чымсьці павінна скончыцца процістаянне калектыву і чалавека, якому некалькі дзесяткаў людзей ужо два тыдні паўтараюць, што больш не хочуць мець з ім нічога агульнага. Але чым? У свой час пра ўсё даведаемся.

Аляксандр БЯРСУДСКІ.

Лёгкі бунт на караблі

ці спосаб выпускання крытычнай масы пары?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

А загарэлася яна, на розум некаторых, у Белавежскай пушчы. Год назад. Ні адзін з пунктаў таго пагаднення, адзначалі дэпутаты, не дзейнічае. Дзе рублёвая зона? Яе няма. Дзе адзіная крэдытна-фінансавая палітыка? Ды і СНД фактычна ўжо няма. Кожны цягне толькі ў сваю нару, топчучы па дарозе суседскую.

З канстатацыяй праблем можна пагадзіцца. Але патрэбек глыбокі аналіз, а галоўнае — шляхі выхаду. Зараз, здаецца, мы пажынаем вынікі нашай аднаварыянтнай палітыкі, калі ўпіраемся ў сцяну, тупік, а пра запасны варыянт ніхто і не думаў. Тады пачынаюцца сутаргавыя крокі, новыя памылкі.

Урад спешна латае дзіркі, парламент ківае пальцам, што марудна і не так, а сам абмяркоўвае пытанні аб спажыўкааперацыі, пажарах, архітэктуры і горадабудаўніцтве... Трэба, трэба аб пажарах, але ці тых?

Пратаргаваліся мы з Расіяй на 100 мільярдаў рублёў, і вінаватага не відаць. Усе ківаюць на крайняга — на прадпрыемствы. Нацыянальны банк у асобе С. Багданкевіча, урад. Ды і сам парламент (на гэты раз такім «крайнім» аказаўся Шушкевіч). Пагодзімся, ёсць доля іх віны. Але мы чамусьці забываем, што прадпрыемствы — дзяржаўныя, а банк — беларускі нацыянальны. А калі так, то яны не збоку, а ў цэнтры, і С. Багданкевіч не бухгалтар, як ён сказаў на сесіі, а палітык. Дарэчы, калі гаварыць пра гандлёвыя адносіны з Расіяй, то нашым банкірам, эканамістам трэба было б разабрацца з імі дакладна. Таму што трэба вельмі пастарацца, каб, атрымліваючы сыравіну, метал, нафту, якія ў працэсе вытворчасці становяцца машынамі, трактарамі і прадаюцца той жа Расіі па шматкратна вышэйшай цане, атрымаць адмоўнае дэбіторскае сальда.

Мы ніяк не можам звыкнуцца з тым, што, стаўшы суверэннымі дзяржавамі, рэспублікі-сёстры былога Саюза маюць свае інтарэсы, якія з нашымі могуць і не супадаць. І абараняюць іх. Ад каго? Ад усіх і нас таксама. Вось тут і павінны сваё слова сказаць палітыкі, прапанаваць такія крокі, каб, вобразна кажучы, мы пілі грузінскую гарбату з украінскім цукрам у рускіх сподачках і з беларускай лыжкай. І ўсім было выгадна. Грузінам, украінцам, рускім. І, канешне, нам. Але для гэтага, як я разумею, трэба мець вялікае майстэрства, якому мы толькі вучымся. Такім урокам для ўсіх бакоў, напэўна, будзе і гэты дзень сесіі.

У рэшце рэшт, пры галасаванні дэпутаты ўсё ж не адправілі Станіслава Станіслававіча, па выразу аднаго з калег, хадзіць вакол крамлёўскай сцяны і лавіць Ельцына. У таго свой з'езд і свая бойка.

Учора сесія ўжо спакойна абмяркоўвала пытанне аб банку і пачала разгляд наступнага. Аб асновах архітэктуры і горадабудаўніцтва. Але пра гэта я ўжо казаў...

Вось і думай цяпер, што ў той дзень было: лёгкі бунт на парламенцкім караблі ці проста выпусканне крытычнай масы пары?

Міхаіл МІХАЕВІЧ.

Трэнеры выбраны, тэрміны зацверджаны

І снежня адбылося пасяджэнне выканкома Федэрацыі футбола Беларусі. З усіх пытанняў, якія разглядаліся на ім, трэба выдзеліць два: па-першае, нарэшце зацверджаны галоўныя трэнеры нацыянальнай і алімпійскай зборных рэспублікі. Імі сталі адпаведна Міхаіл Вергіенка і Іван Савоцікаў, што былі да гэтага толькі «выконваючымі абавязкі».

Па-другое, зацверджаны тэрміны правядзення другога круга чэмпіянату рэспублікі, а таксама паўфіналаў і фіналу. Матчы другога круга чэмпіянату адбудуцца з 4 красавіка па 17 чэрвеня. Паўфіналы кубка — 24 красавіка і 2 мая, фінал — 22 чэрвеня. У календары прадугледжана адно «акно» для зборных — 12 мая. Мяркуецца, што ў гэты дзень алімпійская зборная сустрэнецца ў Мінску з камандай Малдовы, а нацыянальная зборная рэспублікі — са зборнай Літвы.

Віктар ДЗЯТЛІКОВІЧ. (БелаПАН).

РЫБАЦКІЯ ЗГАДКІ

Рукзак ці скрынка?

Адназначнага адказу на гэта пытанне не знойдзецца ў аматараў падводнага лову. Адным даспадобы рыбацкая скрынка, якую можна везці па лёдзе на санках. На яе ў любы момант можна прысесці адпачыць, перакусіць. Іншыя аддаюць перавагу заплечнаму рукзаку. Ен зручны пры пераходзе на значную адлегласць, вызваляе рукі, не перашкаджае пры бурэнні лункі і г. д. Аднак у рукзаку нязручна насіць тэрмас, зімовыя вуды, даводзіцца браць з сабой раскладны стульчык.

Для транспарціроўкі зімовых прылад, тэрмаса, прадуктаў, банкі з мальком, скрынкі з чарвямі многія рыбакі выкарыстоўваюць невялікую лёгкую скрынку, якая змяшчаецца ў... рукзаку і замацоўваецца ў ім «спінка да спінкі». У рукзаку застаецца яшчэ многа месца, куды можна змясціць дастаткова вялікі ўлоў. Канструкцыя скрынкі і яе размяшчэнне ў рукзаку паказаны на малюнках.

Каркас скрынкі (мал. 1) вырабляецца з лёгкіх дзюралевых вугалкоў: ніжняя і верхняя паўкруглыя рамкі (1) — з вугалка 10 мм×10 мм (ці 15 мм×15 мм), а стойкі (2) — з вугалка 20 мм×20 мм. Чатыры стойкі (2) мацуюцца да рамак з дапамогай вінтоў з гайкамі (М4, М5) ці заклёпкамі (3). Да верхняй рамкі на петлях (5) падвешваецца накрыўка (4) з ліста фанеры таўшчынёй не больш 8 мм. Да накрыўкі зверху трэба прыклеіць ліст паралону і абцягнуць дэрматынам. Бакавую сценку скрынкі лепш за ўсё зрабіць з тонкага пластыку, ён лёгка прымае акруглую форму скрынкі і прыдае дадатковую цвёрдасць ёй.



Днішча робіцца з фанеры, а для большай устойлівасці яго неабходна зрабіць крыху большым за ніжнюю рамку (мал. 2.). І днішча, і сценка мацуюцца да вугалкоў з дапамогай такіх жа вінтоў. Цяпер засталося падабраць замок для накрыўкі (ад старога партфеля, сумкі ці аптэчкі) і ўмацаваць на задняй сценцы скрынкі (яна плоская) чатыры раменьчыкі для мацавання скрынкі да спінкі рукзака. Скрынка гатова. Можна па жаданню зрабіць у ёй перагародку (6), каб раздзяліць прадукты і прылады з прынадай.



У такой рыбацкай тары сумешчаны перавагі скрынкі і рукзака: зручная для транспарціроўкі, умяшчальная, камфартабельная. Прысесці можна, не развязваючы рукзака, а ў час «абедзеннага перапынку» столікам можа служыць адкідная накрыўка скрынкі.

САМ САБЕ МЕТЭАРОЛАГ

Зіма: народныя прыкметы

(Заканчэнне. Пачатак у кумары за 20 лістапада).

Назіранні за звярамі і птушкамі паказваюць, што яны лепш, чым людзі, прадчуваюць змены надвор'я. Таму ўважліва сачыце за імі, і яны вам прадкажуць надвор'е на бліжэйшы час.

● Калі певень стаіць на адной назе — будзе моцны мароз. Певень закукарэкаў у мароз — чакай цёплага надвор'я. У сцюжу пеўні заспявалі рана — будзе адлига. Перад моцнымі маразамі куры рана садзяцца на седала і імкнуцца залезці вышэй.

● Перад пацяпленнем птушкі садзяцца на вершаліны дрэў.

● Калі ў моцны холад індык крычыць — неўзабаве падзьме цёплы вецер.

● Птушкі ўвечары кормяцца даўжэй і старанна — да марозу.

● Гусь узнімае нагу — да сцюжы. Загагоча зімой гусь — чакай пацяплення, а калі сядзіць, падкурчыўшы ногі. — да холаду і мяцеліцы; калі хавае галаву пад крыло — таксама да пахаладання.

● Перад марозам вароны і галкі садзяцца на вершаліны дрэў, на ніжнія галінкі — да ветру, на снег — да адлігі. Вароны ўзімку раскрычаліся — чакай мяцеліцы. Варона хавае дзюбу пад крыло — да пахаладання. Калі з самага ранку галкі крычаць і кружацца каля зямлі — чакай завірухі.

● Калі цецерукі і курапаткі пералятаюць у лясны гушчар — чакай бурану.

● Калі ўзімку вераб'і сядзяць на дрэвах і будынінах моўчкі — будзе снег без ветру. А калі дружна цырыкаюць — чакай пацяплення.

● Узімку снягір цырыкае перад адлігай.

● Сарока лезе ў падстрэшша — да завеі.

● Зімой сабака скручваецца абаранкам — да холаду. Калі свойскі сабака цэлы дзень сонны — чакай непагадзі. Калі ўзімку сабака развальваецца на зямлі або спіць, раскінуўшы ногі і жыватом дагары, — чакай пацяплення.

● Ваўкі выюць каля жылля — да марозу.

● Кот імкнецца на цёплую печку — да марозу.

Парады на ўсякі выпадак

Пры няспраўным пыласосе

Праверце, ці не абарваны злучальны шнур (звычайна гэта бывае каля штэпсельнай вілкі). Калі шнур не абарваны і ваш пыласос раней працаваў добра, праверце стан шчотак электраматора. Калі яны моцна зношаныя, можаце замяніць іх самастойна, і пыласос зноў будзе працаваць. Справа ў тым, што з-за зносу шчотак матора спружына надта расцягваецца і кантакт шчоткі з маторам парушаецца.

Пры няспраўным прасе

У многіх выпадках вы здолееце самі адрамантаваць яго. Калі прычына няспраўнасці заключаецца ні ў тым, што разарваны провад або дрэнна закручаны шрубы штэпсельнай вілкі, знаходзіць, перагарэў засцерагальнік. Засцерагальнік вы лёгка знойдзеце, адкруціўшы апору, падэшву праса. Купіце засцерагальнік згодна з тыпам вашага праса і ўстаўце яго замест перагарэлага.

Пры няспраўным радыёпрыёмніку

Трэба спачатку маральна падрыхтавацца, таму што пры сур'ёзных няспраўнасцях давядзецца звяртацца ў майстэрню. Радыёпрыёмнікі забяспечаны трансфарматарам з плаўкім пераключальнікам. Нярэдка няспраўнасці выкліканы перагараннем гэтага пераключальніка. Вы гэта выявіце, калі ніводная лямпачка прыёмніка не загараецца. У такім выпадку замяніце засцерагальнік. Перад зменай плаўкага пераключальніка прыёмнік трэба выключыць.

Як захаваць клей ад высыхання

У хатніх справах клеем даводзіцца карыстацца не вельмі часта. Вы адкрылі бутэлечку з клеем, а праз некаторы час са здзіўленнем заўважаеце, што клей высах. А можна зрабіць так, што адкрытая бутэлечка будзе стаяць месяцамі і не высахне. Для гэтага на рыльца надзяваюць старую гумавую соску з дзірачкай. Праз яе клей будзе выцякаць на паперу. Потым кропелька клею застыне ў дзірачцы, закрые герметычна бутэлечку і тым самым захавае клей ад высыхання. Калі вы будзеце зноў карыстацца клеем, то злёгку патрыце пальцамі застылую ў адтуліне кропельку клею, і дарога клею будзе адкрыта.

Смехатэрапія

Прафесія—вярблюд!

На Анісіма Пятровіча ў заапарку вярблюд плюнуў. Здавалася б (такая справа!), вярблюд, ён і ёсць вярблюд. Жывёліна! Але Анісім Пятровіч пакрыўдзіўся — і таксама плюнуў. А вярблюд вазьмі ды і памры ад стрэсу. Не чакаў такой рэакцыі ад чалавека, не падрыхтаваўся.

Што тут пачалося!

Уся грамадскасць, вядома ж, на бок вярблюда стала—за каўнер Анісіма Пятровіча і ў дырэкцыю.

Тут яму папулярна растлумачылі: вы, маўляў, на жывёліну пакрыўдзіліся.., а ў нас цяпер фінансавы план гарыць. Хто нам вярблюда заменіць? І на Анісіма Пятровіча з цікавасцю глядзяць: вы, маўляў, можа? Вельмі ў вас добра з пляваннем атрымліваецца, пераканаўча. І прапануюць зарплату, якая Анісіму Пятровічу і не снілася.

Карацей кажучы, угаварылі, пакуль у водпуску, папрацаваць в. а. вярблюда, а спадабаецца — і зусім перайсці ў штат заапарка.

Вось так стаў Анісім Пятровіч вярблюдам працаваць, дакладней в. а. Люба-дорага аказалася! То важна па вальеру пройдзе, то ў цянёчку пасядзіць, а то возьме і ў публіку плюне, калі не спадабаецца хто. І хоць бы што, ніякай адказнасці. Наадварот! Публіка ў захапленні, усялякія-розныя ласункі кідае, фотаапаратамі шчоўкае. Анісім Пятровіч да таго ў ролю ўжыўся, што ўжо стаў вярблюджай поўсцю абрастаць, пад вярблюда гарбаціцца, а пляваць усё далей.

Разам з поўсцю расла папулярнасць. Народ у заапарк валам валіць, кожны дзень інтэрв'ю, тэлевізійшчыкі наведваюцца... І ўсе дамагаюцца: як гэта яму ўдалося такую незвычайную прафесію авоіць, да такіх прафесіянальных вышынь узняцца? Анісім Пятровіч разумна гэтак адказвае, філасофствуе, але ўсёй праўды не кажа, утойвае, каб не расчараваць.

Праўда ж у тым, што пляваць на людзей заўсёды яму вельмі падабалася. А калі табе за гэта нічога не бывае ды яшчэ грошы плацяць — пра што яшчэ можна марыць? Толькі пра тое, каб з в. а. хутчэй пераявілі ў паўнацэннага работніка. Гэта значыць, у вярблюда. Пра што і турбуецца цяпер.

Аляксандр ТРАФІМАЎ.

Міліцэйскія хронікі

ШМАТ ГАДОЎ

Шмат гадоў назад маладому следчаму, выпускніку вышэйшай школы міліцыі, даручылі расследаваць і знайсці таямнічыя «засекі Радзімы». Тое, што ён паспяхова справіўся са сваім першым заданнем, сумненняў няма.

Цяпер ён сам, яго сям'я і родныя забяспечаны ўсім і поўнасцю.

НЕ ПАСПЕЎ

Рэкс узяў след. Навастрыўшы вушы, павёў вільготна-прахладным носам і рвануў. Малодшы інспектар Валошын не стаў стрымліваць рвенне службовага сабакі. Ён, ускінуўшыся, скараціў павадок і памчаў за ім.

— Божа! Толькі б паспець,— думалася яму.

Інспектар з сабакам выскачылі з-за вугла шэрага будынка прама насупраць гастранома, дзе ўжо сабраўся і мітусіўся натоўп. Сэрца хваравіта сціснулася.

— Усё! Не паспеў! Апярэдзілі!

Валошын ад злосці скрыгатнуў зубамі:

— Хто... апошні... тут?!

У гастраноме № 14 давалі дэфіцыт.

Васіль КЛЯПЦОЎ.

3 апавяданняў пра Іванцова

ТАВАР

— Свежы тавар?—спытаў Іванцоў у прадаўшчыцы.

— Пазаўчора завезлі,—адказала тая.

«Не буду брацьі»—вырашыў Іванцоў і выйшаў з мэблевага магазіна.

ПАРУШАЛЬНІК

— Часта ездзіце на аўтобусе?—спыталі ў Іванцова дружыннікі.

— Толькі калі няма месца ўнутры,—засаромеўшыся, прызнаўся Іванцоў.

АПЕТЫТ

— Зусім няма апетыту,—паскардзіўся Пятроў Іванцову,—за цэлы дзень з'еў толькі кавалачак хлеба.

— І са мной тое самае,—уздыхнуў Іванцоў,—але я ўсё ж паеў сёння і сяўружкі, і балычка.

Эдуард ДВОРКІН.

Мімаходзь

— У нас не спекуляцыя, не бізнес, а нейкі спекубізнес.

— Воўк пайшоў ад ваўка, мядзведзь ад мядзведзя, слон ад слана і толькі чалавек чамусьці ад малпы.

— Калі мне не спіцца, я лічу баранаў: Іваноў, Пятроў, Сідараў...

— Праўду не заўсёды трэба гаварыць. Калі-нікалі трэба і крычаць.

— Паэт сурова пакараў свайго сына — прымусіў вучыць свае вершы.

— Не ўсе мужчыны аматары выпіць — многія любяць і добра закусіць.

Васіль ТУРЭНКА.

Прымаўкі на новы лад

— Два спекулянты — пара.
— Не маеш валюты, не садзіся.
— Сёмы год, як рыба аб лёд.
— У брокера губа не дурная.
— Зараз у зарплату грабуць грошы лапатай!

«За-да-чы»

● Хлопчык піша на плоце непрыстойнае слова з пятнаццаці літар. На кожным тры літары хлопчык траціць па 62 сантыметры даўжыні плота. Ці змесціцца на плоце непрыстойнае слова, калі даўжыня плота 3 метры 16 сантыметраў?

● Вучоны з суседнім імем інакенція стварыў чаравікі без падэшваў, каб тайна ад усіх хадзіць басаногі. Колькі падэшваў зэканоміць за месяц абутковая фабрыка, выпускаючы ў год па 40.000 пар чаравікаў, з якіх тры чвэрці без падэшваў?

● Аднойчы 40 бабуль лавілі трох парасят. Адно парася схапілі тры бабулі, другое — у два разы больш. Астатнія — трэцяе. Колькі бабуль схапілі трэцяе парася?



КРЫЖАВАНКА

ПА ГАРЫЗАНТАЛЯХ: 7. Сумненне, недавер. 8. Папулярны твор В.-А. Моцарта. 11. Мінерал з пароды сілікатаў. 12. Кароткаствольная артылерыйская гармата. 13. Усходы азімых. 14. Гарызантальная горная выпрацоўка. 16. Апавяданне М. Лынькова. 19. Задор, запал. 21. Балет А. Хачатурана. 23. Опера Д. Вердзі. 24. Інфармацыйны стэнд. 25. Кароткае апавяданне з гумарыстычным або сатырычным змястам. 26. Возера ў Замбіі. 27. Прыток Акі. 29. Даматканая жаночая спадніца. 33. Паэма М. Танка. 34. Жыхар дзяржавы ў Малой Азіі. 35. Марская нерухомая жывёліна. 38. Спартыўны снарад. 40. Старадаўняя назва ізумруда. 42. Прыхільнік рашучых дзеянняў, поглядаў. 43. Матыў, напеў.

ПА ВЕРТЫКАЛЯХ: 1. Знак царскай улады. 2. Мужчынскае імя. 3. Прамысловае ці гандлёвае прадпрыемства. 4. Паэма М. Лермантава. 5. Буйнаэрністы пясон. 6. Беларускі эстрадны ансамбль. 9. Перыядычны друк. 10. Марскі разбойнік. 15. Пляцоўка для канцэртных выступленняў. 16. Сапернік па дыспуту, спрэчцы. 17. Сельскагаспадарчая машына. 18. Нашчадак. 20. Балет С. Пракоф'ева. 21. Верш П. Броўкі. 22. Спартыўная пляцоўка. 28. Горад у Мінскай вобласці. 30. Старажытная манета некаторых еўрапейскіх дзяржаў. 31. У паэтычнай мове: земляроб, араты. 32. Беларускі кампазітар-песеннік. 36. Почырк старажытных рукапісаў. 37. Ізаляванае памяшканне на караблі, самалёце. 39. Востраў у Міжземным моры. 41. Форма, фасон адзення.

Склаў Рыгор ЯКУШ.
г. Мінск.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ 28 ЛІСТАПАДА

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

З Дэлі перадае кар. ІТАР—ТАСС Сяргей БУЛАНЦАЎ

У панядзелак планеты дапамогуць КАЗЯРОГУ ўладнаваць любую асабістую праблему. Для вырашэння фінансавых пытанняў адведзены аўторак і серада. Бізнесмен удачлівы ў ранейшых пачынаннях, але новыя распачынаць пакуль што не варта. Медыцынскія і гандлёвыя работнікі могуць разлічваць на павелічэнне зарплаты ці іншае шанцаванне. Любоўным справам пастаянна штосьці перашкаджае.

Ля самага краю даўгавой ямы рызыкуе аказацца ВАДАЛЕЙ. Лічыце ніводную капейку, бо расходы напераздзе немалыя. Тым не менш, настрой у вас неблагі. Служачы атрымае добрыя весткі адносна далейшай кар'еры. Дама заслужыць падарунак ад мужа ці каханага. Нядаўняя сустрэча аказваецца моцным сардэчным захапленнем. Калі аб'ект вашага інтарэсу нарадзіўся пад знакамі Рака, Скарпіёна ці Рыб, будзьце гатовымі да працяглага рамана.

Нейкія дробныя непрыемнасці непакояць РЫБ. На даным этапе астролаг не рэкамендуе брацца за новую работу — не зможаце ўдзяліць ёй колькі трэба часу. Магчыма, асабістыя абставіны запатрабуюць некалькі адгулаў. Зрабіце падарунак блізкаму чалавеку. Прадпрымальны студэнт вынайдзе спосаб зусім законнага здабывання грошай. Здароўе большасці з вас адпавядае стандартам Амазонкі і Гладыятара.

У нябесным календары АВЕНА тройчы пазначана 7 снежня. Гэты дзень адноўлена спрыяльны для дзелавых спраў, для пакупкі і любоўнага галавакружэння. У астатнія дні падсцерагаюць скрытыя пасткі. Абяцанай пазыцыі ці крадыту могуць даць зваротны ход. Служачы рызыкуе атрымаць сур'ёзную адмову. Вельмі занятая дама раптам выявіць, што яе сябар ходзіць да іншай. Добры скандал у суправаджэнні гарачых абдымкаў адновіць статус-кво.

У ЦЯЛЬЦА 8 і 10 снежня—небяспечныя дні, бо нячысцік пачне нашэптваць недарэчныя парады і падштурхоўваць да недарэчных учынкаў. Тыдзень можа аказацца лёсаносным: даб'яцеся рашучага прарыву ці ўваб'яце апошні цвін у труну амбіцый. Адмерайце тройчы сем разоў, а потым прыміце — рабіць ці не. Ніякіх рэвансцей з блізкімі, інакш даведзеце да граху. Сардэчныя справы выпісваюць сінусоіду.

Планеты дапамогуць БЛІЗНЯТАМ пазбегнуць памылак 7 і 9 снежня, у астатнія дні спадзявайцеся толькі на сябе. Калі вы ўдачлівы прадпрымальнік, пра вас збіраюць канфідэнцыяльную інфармацыю, каб выкарыстаць яе ў мэтах карысці ці шантажу. Паплечнік не з самых блізкіх можа рэзка змяніць палітыку. Схільную да інтрыг дамачку ўцягваюць у тайную змову. Астролаг сцвярджае, што іншы раз карысна і апячыся.

Тыдзень рэалізаваных магчымасцей абяцаецца РАКУ. Ярка праявяць сябе творчыя натуры. Пісьменнік, музыкант, мастак і журналіст створаць маленькія шэдэўры. Добрая перспектыва адкрыецца перад дзелавым чалавекам — кожнае пачынанне будзе паспяховым. Служачы атрымае цвёрдыя запэўніванні ў тым, што яго павышэнне адбудзецца на працягу бліжэйшых тыдняў. Яго вялікасць нахопне заваладае думкамі тых, хто не пасцёг сакрэтнуць рубеж —40.

У цэлым спрыяльны перыяд для ЛЬВА. Завяжаце карысныя ў доўгатэрміновым плане знаёмства. Не спяшаецеся ставіць крыж на правяце, яні не прынёс неадкладна жаданых вынікаў. Цярпеннем і настойлівай працай зберажаце багаты плён. Даследчыкі — а таксама следчыя — усіх напрамкаў даб'юцца добрых вынікаў. Задача служачага —не даць ашукаць нядобразычліўцу. Цудоўны пол забудзецца на ранейшыя хваробы.

Зігзагападобна складваюцца абставіны на рабоце ў ДЗЕВЫ. Пастаянна штосьці адцягвае ўвагу, да таго ж вы схільныя узяцца за некалькі спраў адначасова. Настойлівы рэкамендуецца ўстрымлівацца ад няпэўных здзелак. Заняты прадпрымальніцтвам сямейны дуэт даб'ецца буйнога поспеху. Магчыма, увагі запатрабуе старэйшы сваяк. Мужчына ва ўзросце ад 40 да 50 гадоў захапляецца застоллем са спіртным. Ці не ад таго акругляецца на вачах?

На чашы ШАЛЯЎ ляжа мноства выгадных прапаноў і — небяспекі, якія ў іх тоўпяцца. Парада астролага: не ўкладваце грошы ў доўгатэрміновыя здзелкі, а 8, 9 і 12 снежня не вядзіце ніякіх дзелавых перамоў і тым больш не падпісваце дакументаў. Хатнім гаспадыням прыйдзецца вышукваць дадатковыя сродкі для падтрымання бюджэту. Да ведама фліртуючых дам: муж вернецца з камандзіроўкі раней тэрміну...

Спрыяльны дзень СКАРПІЁНА — панядзелак задае тон усяму тыдню. Канфігурацыя планет складваецца вельмі ўдала: служачы будзе адзначаны, любая заява ці прашэнне будуць успрыняты пазітыўна, муж і жонка быццам занава перажываюць мядовы месяц. Новае знаёмства з Авенам, Блізнятамі, Львом ці асобай, якая нарадзілася пад вашым знакам Задыяка, — гэта лёс. Шчаслівы ці злы, але ваш лёс.

Панядзелак для СТРАЛЬЦА — аптымальны дзень штурму бюракратычнай цвярдыні. Вашы справы яўна на ўздыме, планеты да вас прыязныя, таму рашуча патрабуйце павышэння па службе або альтэрнатыўных даброт. Адзінокай даме трэба расстацца з наханым, які намнога старэйшы —ваш сексуальны саюз пазбаўлены будучыні. Не выключана перспектыўная сустрэча з Ракам ці Скарпіёнам, адносіны з адным з іх з часам напоўняцца шлюбнай гармоніяй.

СУБОТНІМ ВЕЧАРАМ

ФІЗІКА Ў ШКЛЯНЦЫ ВАДЫ

Мы ўжо неаднаразова звярталіся да гэтай тэмы — самых простых доследаў са шклянкай з вадой (гл. «Суботнім вечарам» за 31 кастрычніка, 7, 14 і 28 лістапада). Сёння раскажам яшчэ пра адзін, праўда, ужо не са шклянкай, а з бутэлькай.

З бутэлькі (лепш малочнай) зрабіце імправізаваны тэрмометр. Вазьміце тонкую празрыстую трубку (пусты стрыжань з-пад шарыкавай ручкі або празрыстую «саломінку» для кактэйля) і прапусціце яе праз корак. Бутэльку напоўніце вадой да краёў і закаркуйце так, каб частка вады выціснулася ў трубку. За ўзроўнем вады будзе лягчэй сачыць, калі папярэдне падфарбаваць яе чарнілам або фарбай.

Падстаўце гэты «тэрмометр» пад гарачы струмень вады з-пад крана і ўважліва сачыце за слупком вады ў трубцы. У першы момант, як ні дзіўна, слупок папаўзе не ўверх, а ўніз, і толькі прыкметна апусціўшыся, праз нейкі час слупок спыніцца і потым пачне падымацца. Урэшце ён падымецца вышэй першапачатковага ўзроўню і на гэтым супакоіцца. Калі захоўваць ранейшымі гарачы струмень і становішча бутэлькі, ніякіх перамен са слупком больш не будзе.

Калі бутэльку падставіць пад струмень халоднай вады, атрымаецца супрацьлеглы малюнак: слупок «тэрмометра» спачатку пойдзе ўверх і толькі потым апусціцца.

Прычына такой непаслядоўнасці ў паводзінах «тэрмометраў» ў адначасовым дзеянні двух фактараў: цеплавога пашырэння вады і пашырэння самой бутэлькі. Паколькі павелічэнне ёмістасці шкляной бутэлькі нязначнае ў параўнанні з павелічэннем аб'ёму вады ў ёй, то вышыня слупка ў трубцы ў рэшце рэшт узрасце.

Але ж трэба ўлічваць яшчэ і фактар часу — для награвання вады і шкла патрабуецца розны тэрмін. Вось гэта і ёсць галоўная прычына нечаканых паводзін слупка вады ў трубцы.

Для гэтага доследу мае значэнне таксама і матэрыял, з якога зроблена бутэлька. Напрыклад, калі ўзяць празрысты мяккі пластыкавы флакон з-пад шампуню і г. д., то «шкала» ў трубцы з вадой будзе перакуленай — пры павышэнні тэмпературы слупок канчаткова ідзе ўніз, пры паніжэнні — падымаецца. Тлумачыцца гэта тым, што мяккі пластык пры зменах тэмпературы пашыраецца і сціскаецца мацней, чым вада ў ім.

Паспрабуйце паставіць такі нескладаны вопыт ў хатніх умовах. Нагадаем толькі: калі гарачую бутэльку падставіць адразу пад халодны струмень, то яна можа лопнуць і нарабіць вам тым самым шкоды. Таму астудзіце яе паволі і толькі потым працягвайце доследы.

РАДЫЁ

6 снежня

Апошнія паведамленні: 8.00, 7.50, 15.00, 19.45, 23.00, 23.55.

6.15 — «Зямля наша родная». Канцэрт. 7.35 — «Дзесяць хвілін сацыёлага». 8.00 — вершы М. Ісакоўскага і А. Суркова. 8.40—песні Э. Зарыцкага. 9.15—«Смяяцца не грэх». Гумарыстычная перадача. 10.00 — «Жадаю Вам...» Канцэрт-віншаванне. 11.00—«У эфіры — Віцебск». Інфармацыйна - публіцыстычная праграма. 11.30 — «У вольную хвіліну». Музычная праграма. 12.00 — «Дайце рады! Чалавек у экстрэмальнай сітуацыі». 12.20—«Праграс». Весткі з Акадэміі навук. 12.45—«Поп-хвала». 13.00 — «Паходня». Праграма для вайскоўцаў. 14.00 — «Чалавек сярод людзей». 15.15 — «Вяртанне да вытокаў». 15.30 — «Добрага вам здароўя!» Радыёчасопіс. 16.05—«Клуб дзівакоў». 16.30—«Поўны каданс». Вядучы — кампазітар З. Бутуковіч. 17.00 — «Часопісу «Полымя» — 70 гадоў». Выступленне галоўнага рэдактара С. Законнікава. 18.00—«Дудка беларуская». Пра духоўнае адраджэнне. 18.40 — «Мае мадонны». Музычна-літаратурная кампазіцыя ў чатырох навелах. 19.45—«Дзень нашага жыцця». 20.05—вячэрняя казка. 20.30—«Вячэрнія зарніцы». 21.00 —«У 5-й студыі, на Чырвонай...» Радыёрасказ пра міжнародны Шагалаўскія чытанні. 23.10 — «Моладзі пра музычнае мастацтва». 0.00—«Начны канал».

ТЭЛЕБАЧАННЕ

6 снежня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Гары, гары ясна...» Маст. фільм. 2-я серыя.
9.55. «Памяць аб вялікай вайне». Дак. фільм «Паўстань, краіна родная».
10.55. Як захаваць зрок дзіцяці. Перадача 5-я.
11.10. Вас выклікае Спартландыя.
12.10. Гандбол. СКА-2 (Мінск) — АТХК (Рыга).
12.45. Урокі здароўя. Аздараўленчыя аспекты ўсходніх адзінаборстваў.
13.15. «Сівой даўніны покліч. Помнікі расказваюць». «Пецяргоф».
13.40. Гандбол. СКА-1 (Мінск) — «Гранітас» (Каўнас).
14.15. Час пісьма.
14.35. Тэлебом.
15.45. Кінаэкран-92. Снежань.
17.00. Аўтарскі вечар кампазітара Эдуарда Казачкова. 1-е аддзяленне.
18.05. Брама. «Пакуты навукі». Перадача 1-я.
18.50. Аўтарскі вечар кампазітара Эдуарда Казачкова 2-е аддзяленне.
20.00. Панарама.
20.30. «Каскад».
20.40. Калыханка.
21.00. Студыя «Тэлесябрына». «Пепсі-топ-20».
21.40. Студыя «Формула».
23.00. «Сінема» прадстаўляе: «Закон ёсць закон». Маст. фільм (Францыя).

Канал «Астанкіна»

6.00. Гадзіна сілы духу.
7.00. Тыраж «Спортлато».
7.15. Канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца Калмыкіі «Айраты».
7.45. Чэмпіянат свету па мастацкай гімнастыцы.
8.30. Раным-рана.
9.00. Пакуль усе дома.
9.30. Ранішняя зорка.
10.20. Гэта вы можаце.
11.00 «Прыгоды Чорнага Прыгажуна». Маст. фільм.
11.25. Хіт-топ-шоў «50×50».
12.25. Мультфільм «Піф і Геркулес».
12.35. Дак. фільм «Падводная адысея каманды Кусто».
13.25. Шматсерыйны фільм «Дом на Валхонцы». Фільм 8-ы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Жывое дрэва рамёстваў.
16.00. Панарама.
16.40. Тэлелоцых.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Цудоўная сямёрка.
19.00. «Сярэбраны паўмесяц». Ашгабадскі міжнародны кінафестываль.
19.15. Маст. фільм «Забойства Трошкага».
21.00. Навіны.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. Матадор.
23.00. Навіны.
23.20—0.55. Хіт-топ-шоў «50×50».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. «Забароненыя песенькі». Дак. фільм.
7.50. Мульці-пульці. «Шлёп, чмяк, бразь».
8.00. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
8.30. Фальклор. «Невядомыя культуры».
9.00. Наш сад.
9.30. «Прыгоды ў каралеўстве». 15-я серыя.
10.00. Аты-баты...
10.30. Хочаце, верце...
11.00. «Крывая разлому. Хроніка трывожнага часу». 3-я і 4-я серыі.
12.20. Мульці-пульці. «Вяртайся, Капітошка», «І было добра».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. «Не высечы...» Вядучы У. Цветаў.
13.35. «Упершыню...» Англійская прэмія рускаму раману.
14.05. «На зямлі жылі-пражылі мы не дарма». Яўген Мартынаў.
15.05. Познер і Донах'ю.
15.35. Белая варона.
16.20. «Крокі». Вядучы — прафесар Д. Валкагонаў.
17.00. «І было свята, і ёсць тэатр...» І Міжнародны тэатральны фестываль імя А. П. Чэхава.
18.10. Клуб «Жоўтая падводная лодка».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Класічныя фільмы Галіўўда. «Сабатаж».
21.00. «Сузор'е стралкоў». Дак. фільм Ю. Подніекса.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30—23.30. Начны клуб Ос-Эн-Сі.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАУЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзелы пісьмаў — 32-04-52, 32-11-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91. Тэлефакс: 32-22-03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 242.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Л 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ШКОЛА ПРЫГАЖОСЦІ

Духоў чароўны водар

● Класічныя правілы рэкамендуюць бландзінкам водары больш лёгкія, далікатна-кветкавыя. Брунеткі могуць аддаць перавагу духам з экзатычным пахам. Але гэтыя правілы вельмі ўмоўныя, бо колькі людзей — столькі і густаў.

● Выбіраючы новыя духі, не нюхайце шмат флаконаў запар: вельмі хутка вы ўжо не здолееце адрозніць адзін пах ад другога. Таму лепш за ўсё, пакуль не знойдзеце свой варыянт, купляць маленькія флаконы (або «пробныя» духі).

● Змачыўшы духамі тканіну або рукі, не спрабуйце адразу ж зрабіць вывад, ці падабаецца вам гэты пах. Крыху пачакайце — асноўны водар з'явіцца хвілін праз пятнаццаць. Гэты пах будзе трымацца некалькі гадзін.

● Ні ў якім выпадку нельга наносіць духі на скуру, толькі нядаўна працёртую адэкалонам. Духі і адэкалон узаемавыключаюць адзін аднаго. Інакш вас будзе суправаджаць пах з даволі непрыемным букетам.

● Трапіўшы на адзенне, асабліва светлых колераў, духі могуць пакідаць плямы. Памятайце пра гэта: будзьце акуратнымі. А яшчэ лепш прышыць з унутранага боку адзення кавалачак шарсцяной тканіны, які і змочваць духамі. Можна павесіць у шафе марлю, якую намачыць духамі: гэты пах пяройдзе на адзенне.

● Шоўк — і натуральны, і штучны, капрон, нейлон не ўтрымліваюць, не захоўваюць водар. Так што не спрабуйце выліць на іх цэлы флакон духоў — усё будзе дарэмна.

● Калі ідзе дождж, раім выкарыстоўваць духі з моцным пахам — выпарэнні ад вады змяншаюць іх моц.

● Летам, у гарачыя і вільготныя дні, калі ўзмацняюцца прыродныя пахі цела, трэба карыстацца лёгкімі духамі са свежым водарам зеляніны і кветак.

● Зімой пры сухім і халодным паветры ўласныя пахі зводзяцца да мінімуму, таму зімовыя месяцы — час для моцных духоў, сезон для ружавага масла і ўсходніх водараў.

● Калі вы асцярожныя ў выкарыстанні парфумы, наносьце духі ў тых месцах, дзе адчуваецца біццё пульсу: на ўнутраным баку запясця, скронях, на локцевым згібе, на мочках і падкаленных ямках.

● Да самых папулярных духоў апошняга часу можна аднесці амбравыя, кветкава-лясныя духі «Жэ-озэ», што рэкамендуюць жанчыне, якая не проста сочыць за модай, але і сама стварае яе.

● Кветкава - фруктовыя духі «Кландэсцін» — для жанчыны-загадкі, таямнічай і недасягальнай, зачараванай летуценніцы.

● Сімвал вечнай жаноцкасці — духі «Фіджы». Багаты кветкава-зялёны букет падыдзе жанчыне пяшчотнай, спакойнай, далікатнай з вытанчаным густам. Жанчына духоў «Фіджы» — гэта сама пяшчота.

Каб быць заўсёды чароўнай, вы павінны памятаць:

1. Водар праяўляецца на кожным тыпе скуры па-рознаму. Тлустая скура ўспрымае іх хутчэй, чым сухая.
2. Духі трэба захоўваць у цёмным месцы. Пад уздзеяннем сонечных промняў яны распадаюцца і набываюць непрыемны пах.
3. Водар добра трымаецца на валасах. Пасля мыцця валасоў трэба выцерці іх, падсушыць фенам і надушыць.
4. Выбіраючы ўласны пах, аддайце перавагу таму, які адпавядае вашаму характару або тэмпераменту. Пры гэтым неабавязкова быць бландзінкай або брунеткай.

САМ-НАСАМ З ЛЮСТЭРКАМ

Якія валасы вам да твару

Каб выглядаць прывабнай, жанчына здаўна карыстаецца самымі рознымі касметычнымі сродкамі. Яе стараннi накіраваны не толькі на твар, але і на валасы. Звычайна жанчыне мала схадзіць у цырульню і зрабіць новую стрыжку або прычоску. Калі змяняць, дык і форму прычоскі, і колер валасоў. На жаль, выбіраючы фарбу, мы часта арыентуемся на знаёмых, не ўлічваючы асаблівасцей свайго твару і колеру вачэй. І гэта прыводзіць да процілеглага выніку — выглядаем мы горш.

Які колер выбраць? Існуе дзевяць асноўных колераў: чорны, карычневы, цёмна-карычневы, каштанавы, светла-каштанавы, цёмна-русы, русы, светла-русы і зусім светла-русы. Акрамя іх, існуюць і адценні (чырвонае, залацістае, попельнае).

Калі ў вас матавы колер твару, выберыце адценні залацістай гамы, а не попельнай, інакш твар будзе выглядаць зямлістым;. калі твар светлы і ружовы, вам будзе пасаваць попельная гама.

Калі ў вас

— русыя валасы, светлы твар і вочы, то выберыце руса-попельны колер;

—русыя валасы і вочы пад колер арэха — залаціста-русы, жоўта-чырвоны або медны;

— русыя валасы са светлым тварам і карыя вочы—светла-каштанава-русы;

— каштанавыя валасы з карымі вачыма і матавым тварам —светла-каштанавы або залацісты;

— каштанавыя валасы са светлымі вачамі і тварам—цёмна-каштанавы або глыбока-карычневы;

— цёмна-карычневыя валасы з карымі або чорнымі вачамі і матавым тварам — зусім чорны.

На практыцы прынята рабіць больш светлымі прыродныя колеры, гэта змякчае рысы твару. Але цёмныя валасы пры светлым твары і бліскучых вачах падкрэсліваюць характар.

ЧЫСЦІМ, МЫЕМ

Як выдаліць плямы ад кавы, какавы і гарбаты

Гэтыя плямы раім спачатку працерці бензінам, а потым прамыць нашатырным спіртам, разведзеным напалову з вадой. Плямы на тонкіх шаўковых кашулях і сукенках спачатку намочваюць крыху нагрэтай гліцэрынай, а праз 5—10 хвілін прамываюць цёплай кіпячонай вадой. Для вывядзення плямаў ад гарбаты выкарыстоўваюць сумесь гліцэрыны з нашатырным спіртам (на 4 часткі гліцэрыны 1 частка спірту).

Плямы ад кавы з льняных і бавоўняных тканін выводзяць 5-працэнтным растворам солі ў вадзе. На шарсцяной тканіне залітыя кавай месцы змазваюць гліцэрынай і адмываюць цёплай вадой, пасля чаго вільготную тканіну прасуюць з левага боку.

Для вывядзення плямаў ад кавы з шаўковых тканін карыстаюцца сумессю з 20 частак гліцэрыны, 20 частак вады і 1 часткі нашатырнага спірту. У гэтай сумесі вытрымліваюць тканіну на працягу некалькіх гадзін. Затым выціраюць чыстай анучкай месцы, дзе ёсць плямы, і прамываюць вадой.

Плямы ад кавы можна вывесці наступным спосабам: нацерці пляму сумессю яечнага жаўтка і гліцэрыны, потым прамыць цёплай вадой і вільготнай адпрасаваць з левага боку.

ЖАНОЧЫЯ САКРЭТЫ

Як спадабацца мужчыну

— Не спрачайцеся з мужчынам, а ў прысутнасці яго—з іншымі, лепш памаўчыце.

— Хваліце яго, захапляйцеся яго розумам, прывабнасцю, абаяльнасцю, выглядам, асабліва пры ўсіх.

— Усяляйце ў яго ўпэўненасць у яго сіле, а таксама ў яго высакароднасці, працавітасці, шчодрасці і любві да вас.

— Будзьце пяшчотнай з ім і часцей паўтарайце, што вы яго кахаеце, што ніхто ніколі так кахаць яго, як вы, не будзе.

— Нічым, ніколі не папракайце яго. Замест папроку ў асобных выпадках паплачце (без усхліпвання).

— Калі яму хочацца цалавацца з вамі, радасна і з задавальненнем цалуйцеся з ім і гэтак далей.

— Не забывайце паўтараць яму, што блізкасць з ім прыносіць вам асалоду, чаго не было з іншымі (калі ён ведае, што іншыя былі).

— Ніколі не будзьце грубай з ім, а тым больш з іншымі. Будзьце неназойлівай і ўступлівай.

— Не расказвайце яму ніколі аб вашых былых палюбоўніках і не распытвайце яго ні аб чым. Не надавайце перабольшанага значэння яго «здрадам», таму што ён усё роўна кахае вас, і вы павінны быць упэўнены ў ім.

— Цікаўцеся яго справамі, яго прафесіяй, падкрэсліваючы, што ставіце яго справу вышэй за ўсё, адсоўваючы свае асабістыя занятак на другі план. Распытвайце яго, прасіце парады, прасіце растлумачыць.

— Гаварыце яму, што вельмі моцна любіце яго бацькоў, асабліва маці.

— Выказвайце ім, асабліва ёй, знакі ўвагі.

— Пакідайце свайго каханага час ад часу ў адзіноце.

— Ніколі не губляйце пачуцця ўласнай годнасці, не бегайце за ім.

— Пры ім будзьце заўсёды ў добрым настроі, часцей усміхайцеся і смейцеся, асабліва калі ён жартуе.

— Ніколі ні з кім пры ім не какетнічайце і не давайце ніякіх падстаў для рэўнасці. Гэта вельмі шкодна.

— Не старайцеся рабіць выгляд разумнейшай за яго, няхай ён бачыць, што вы самастойная, але што менавіта ён ваша апора, роднае плячо.

— Бярыце ад яго падарункі і грошы весела, з удзячнасцю, з вялікім задавальненнем, каб ён гэта разумеў.

— Умейце смачна гатаваць, але ніколі не прымушайце яго есці, а тым больш піць.

— Пазбягайце мужчын неразумных, скупых, гультаёў і п'яніц.